Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Незапячатаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— 60 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	8 р. — к.

Зьмена адрасу: іншагародніх — 20 к. мясцовых — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок капітэрай пасьля тэксту — р. 50 к.
За радок капітэрай спэрэд тэксту 1 р. — к.
За радок капітэрай перад газетай 1 р. 50 к.
Сьвяшчэнны на 50 проц. дарожэй.
Зьнак тарыфу бярэцца 10 проц. кошту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт . . . 35 кап.
За кожны сьлядковы . . 15 „
Воспрацоўк. і чырвонаармейцы за дакумэнт . . 15 „
За кожны сьлядковы . . 5 „
Публікацыі ЗАГС'ы—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пошт.-тэл. канторах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 299 (2487) Пятніца, 28-га сьнежня 1928 г.

Рэзалюцыя VII Менскай акруг. партканфэрэнцыі

па дакладу Менскага Акруговага Камітэту КП(б)Б.

Заслухаўшы справаздачу т. Славінскага аб дзейнасьці Менскага Акруговага Камітэту КП(б)Б, 7-я акруговая партыйная канфэрэнцыя прызнае палітычную лінію правільнай і работу здавальняючай.

Канфэрэнцыя адзначае, што, ня гледзячы на складаную і цяжкую абстаноўку працы: прымежнасьць акругі, аграрнае перанасяленьне, дэфіцытнасьць бюджэту, кан'юктурныя цяжкасьці, нацыянальнае перапляценьне і г. д. Менская партыйная арганізацыя дабілася значных дасягненьняў у справе разгортваньня сацыялістычнага будаўніцтва, што было магчыма дзякуючы своечасова разгорнутай працы па правядзеньні ў жыцьцё пастаноў XV зьезду УсесКП(б), напружанай працы і згуртаванасьці ўсёй партыйнай арганізацыі, праводзячай сваю працу пад ленінскім партыйным кіраўніцтвам.

Канфэрэнцыя з асаблівым здавальненьнем канстатуе, што Менская акруговая партыйная арганізацыя, дзякуючы правільнаму кіраўніцтву з боку акруговага, зьяўляецца ідэалёгічна вытрыманай, бальшавіцка-ленінска згуртаванай, даўшай своечасова рашучы адпор як меншавіцка - трацкісцкай контр-рэвалюцыйнай апазіцыі, гэтак і падчас рашучую барацьбу з правым ухілам і прымірэнчымі адносінамі да яго, якія прабуюць сьцягнуць партыю з правільнага ленінскага шляху, намечанага XV зьездам партыі.

Канфэрэнцыя ўхваляе ўсе мерапрыемствы, праведзеныя АБ дзеля павялічэньня тэмпу загатовак, спагнаньня падатку, рэалізацыі пазык, забесьпячэньня рабочых гарадоў хлебам, а таксама і забесьпячэньня бяднацкай часткі вёскі хлебам. Адначасова з гэтым канфэрэнцыя даручае ўсёй партыйнай арганізацыі прыняць усе меры да поўнага выкананьня плану хлебных і сыравых загатовак, поўнага спагнаньня сельгаспадатку, страхоўкі, запазычанасьці па ссудах, паявых узносах, рэалізацыі 2-й пазыкі індустрыялізацыі і г. д., згодна маючыхся зададзеньняў на 1928-29 г.

Канфэрэнцыя заластрае ўвагу ўсёй партарганізацыі на неабходнасьці працягваць рашучую барацьбу з ухіламі ад бальшавіцкай лініі нашай партыі як з правым адкрыта-апартуністычным ухілам, які ў даны перыяд зьяўляецца галоўнай небясьпекай, гэтак і з падпімаючым галаву „левым» (трацкісцкім) ухілам і прымірэнчымі да іх адносінамі.

Канфэрэнцыя ўпэўнена, што ўсякім апартуністычным хістаньням, што ўсякай неахайнасьці ў рэвалюцыйнай тэорыі, прымірэнчым адносінам да ўхілаў Менская партыйная арганізацыя процівапаставіць непрымірымую няўхільную барацьбу за чыстату генэральнай лініі партыі і ленінскай ідэалёгіі.

Канфэрэнцыя заклікае ўсіх членаў партыі больш глыбока вывучыць карэньні хістаньняў і ўхілаў в тым, каб вывучаючы іх, цьвёрда абараняць ленінскую палітыку нашай партыі.

Падзеі, меўшыя месца ў апошні час па шэрагу прадпрыемстваў, у БДУ, у асобных школах, дыскусіі на пытаньні аб рэпэртуары тэатру, лісты ў рэдакцыю і г. д., сьведчаць аб росьце і актывізацыі шавінізму (рускі, беларускі, яўрэйскі, польскі), праяўленьні нацыянал-дэмакратычных тэндэнцый і правага ўхілу ў нацыянальна-культурных пытаньнях, зьяўляючыхся вынікам націску варожых нам сіл і адсталых асобных недастаткова ўстойлівых камуністых.

Лічачы, што „нацыяналізм нясе найвялікшае разбэшчаньне ў рабочае асяродзьдзе, наносіць найвялікшы ўшчэрбак справе пралетарскай клясавай барацьбы», і ўлічваючы неабходнасьць «барацьбы з усякім нацыяналізмам усіх нацый, адстайваньне адзінства пралетарскай барацьбы і пралетарскіх арганізацый» (Ленін), канфэрэнцыя заклікае ўсю партыйную арганізацыю павесьці рашучую барацьбу з вылазкамі клясавага ворага, працягваючы далейшае глыбокае растлумачэньне сутнасьці нацыянальнай палітыкі нашай партыі, павёўшы больш рашучую барацьбу з шавінізмам і нацыянал-дэмакратызмам, выкрываючы іх клясава-варожую сутнасьць, узмацніўшы інтэрнацыянальнае выхаваньне рабочых мас, памятаючы, што ва ўсёй нашай культурна-масавай рабоце павінен быць ажыцьцёўлен лёзун нашай партыі: «культура нацыянальная па форме і пралетарская па зьместу».

Адзначаючы, што правядзеньне лёзунгу партыі аб самакрытыцы дало значныя вынікі ў справе паляпшэньня працы савецкіх, гаспадарчых, прафесыянальных, партыйных і інш. арганізацый і дапамагло выкрыцьцю злоўжываньняў, бядайных адносін да патрэб рабочых і сялян і ачышчэньню з апарату элементаў, якія разлажыліся (зембінская справа, плешчаніцкая, бяромльская, астр.-гарадзецкая, справа Гусаіна і г. д.), разам з гэтым канфэрэнцыя канстатуе, што самакрытыка зьнізу яшчэ ўсім недастаткова разгорнута. Канфэрэнцыя абавязвае партарганізацыю і прафсаюзы прыняць усе захады да больш шырокага разгортваньня самакрытыкі і ўнутры-партыйнай дэмакратыі, больш сур'ёзных адносін да рабкораўскіх артыкулаў, паданьняў рабочых сходаў і своечасовага рэагаваньня на ўсякія праяўленьні і вылазкі клясавых ворагаў.

У вімовы перыяд павінна быць удзелена асаблівая ўвага бальшавіцкаму выхаваньню партыйнай арганізацыі; у працу школ, палітгурткоў, вяч. камвузу, нядз. камвузу, завочнага камвузу павінны быць уцягнуты больш шырокія колы партыйных мас. Канфэрэнцыя даручае АБ намеціць канкрэтныя мерапрыемствы па перападрыхтоўцы вясковага і гарадзкога нізавога партыйнага актыву.

Адзначаючы рост прамысловасьці, павялічэньне капітальных укладаньняў, канфэрэнцыя зьвяртае ўвагу гаспадарчых органаў, партыйнай арганізацыі, прафсаюзаў на пытаньні гаспадарчага будаўніцтва: вытворчыя праграмы, забесьпячэньне сырцом, капітальнае будаўніцтва, узмацненьне плянавасьці, скарачэньне тэрмінаў новага будаўніцтва і яго затаненьне, зьніжэньне сабекошту прадукцыі ня менш, чым на 7 проц., падняцьце якасьці прадукцыі, падняцьце прадукцыйнасьці працы і працоўнай дысцыпліны — усе гэтыя важнейшыя пытаньні павінны быць у цэнтры ўвагі штодзённай працы партыйных, прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый.

Канстатуючы вусім недастатковую масавую працу на прадпрыемствах, у цэху, у клюбах і слабое кіраўніцтва гэтай працай з боку прафсаюзаў і ячэек КП(б)Б, канфэрэнцыя заластрае ўвагу праф. і партарганізацый на неабходнасьці дабіцца рашучага пералому ў бок паляпшэньня масавай працы ў цэху і ў клюбах, паляпшэньня працы нізавых партзьвеньняў (цэх'ячэек, цэх'оргаў, групоргаў, выморгаў і г. д.), паляпшэньня працы вытворчых нарад, камісій, больш шырокага ўцягненьня рабочых у актыўнае абгаварэньне гаспадарчых пытаньняў як наогул, гэтак і зьвязаных з працай свайго прадпрыемства, памятаючы, што толькі пры ўмовах паляпшэньня партыйнай працы ў цэху будзе магчыма палепшыць масавую працу, таму задачай кожнай ячэйкі, кожнага партыйца зьяўляецца—быць застрэльшчыкам на сваім прадпрыемстве, у сваім цэху ў паляпшэньні партыйна-масавай і культурна-асьветнай працы.

Адзначаючы правільнае рэгуляваньне росту арганізацыі з боку акругкому КП(б)Б, дзякуючы чаму з агульнага ліку прынятых у партыю рабочыя складаюць 70,9 проц., разам з гэтым канфэрэнцыя адзначае недастатковы рост партарганізацыі за кошт рабочых буйных прадпрыемстваў, батракоў, сельгасрабочых, тому канфэрэнцыя прапануе прыняць усе меры да сыстэматычнага і рэгулярнага павялічэньня росту партыі за кошт рабочых і работніц, асабліва в буйных прадпрыемствах в вялікім вытворчым стажам з тым, каб да студзеня 1930 году процант рабочых ад варштату быў даведзены ў Менскай арганізацыі ня менш 50 проц, для чаго з агульнага ліку прымаемых у партыю рабочых павінны складаць ня менш 80 проц. Канфэрэнцыя абавязвае ўсе райкомы і ячэйкі сьвярнуць асаблівую ўвагу на своечасовую падрыхтоўку і пераводз з кандыдатаў у члены партыі, асабліва рабочых, адначасова мець больш асьцярожны падыход як пры прыёме, гэтак і пры пераводзе служачых.

Канфэрэнцыя даручае акругкому падрыхтаваць пытаньне аб чыстцы нашай партарганізацыі.

Вялікае значэньне ва ўсёй нашай працы мае правільнае правядзеньне ў жыцьцё пастаноў партыі па нацыянальным пытаньні. Пытаньне беларусізацыі для нашай партыі зьяўляецца буйнейшым палітычным пытаньнем, а між тым у некаторай частці арганізацыі не праўлена дастатковых намаганьняў для практычнага выраўнаньня гэтай задачы. Адзначаючы шэраг дасягненьняў Менскай партарганізацыі ў правядзеньні нацпалітыкі, канфэрэнцыя прапануе ўзмацніць тэмп працы па беларусізацыі, а таксама працу сярод нацменшасьцяй, павёўшы рашучую барацьбу з маючымися выпадкамі антысемітызму, рускага, беларускага, яўрэйскага і польскага шавінізму, узмацніўшы выхаваньне рабочых у інтэрнацыянальным духу.

Апошні год характарызуецца больш шпаркім разгортваньнем калгаснага будаўніцтва, але далейшае стварэньне новых калгасаў у значнай меры будзе залежаць ад посьпехаў працы як старых, гэтак і новых арганізаваных калгасаў. Канфэрэнцыя зьвяртае асаблівую ўвагу партарганізацыі на неабходнасьць разьвіцьця новых калгасаў, сталей дапамогі калгасным гаспадаркам, увязкі землеўпарадкаваньня з арганізацыяй сельгаскалектываў, скарачэньня землеўпарадкаваньня ва ўжо арганізаваных калектывах, лепшай пастаноўкі працы ў савгасах, паляпшэньня жыльлёвых умоў і культурна-масавай працы ў савгасах, дапамогі савгасамі акалічнаму бяднацка-серадняцкаму насельніцтву в тым, каб савгасы і калгасы былі сапраўднымі прыкладамі для сялянства.

Адзначаючы некаторы рост кааперацыі як спажывецкай, гэтак і сельскагаспадарчай і павялічэньне збору паявых капіталаў, канфэрэнцыя прапануе функцыям кааперацыйных арганізацый, асабліва па лініі сельска-гас. кааперацыі ўзмацніць працу па збору паявых узносаў і наогул павялічэньня кааперавання батракоў, бедноты і серадняцтва.

Канфэрэнцыя абавязвае ўсіх членаў і кандыдатаў партыі ўступіць у члены кааперацыі.

Праходзячая справаздачна-выбарчая кампанія сельсаветаў зьяўляецца праверкай працы партыйнай арганізацыі і ўплыву яе на масы. Выбары саветаў у сучасны перыяд зьяўляюцца арэнай абвастрэньня клясавай барацьбы і спроб варожых сіл процівастаўіць сябе савецкай уладзе і камуністычнай партыі. Партыйныя арганізацыі, праводзячы гэту працу, павінны праверыць, у якой ступені ўся ўстаноўка практычнай працы ў вёсцы адказвае асноўнаму лёзунгу нашай партыі ў вёсцы «апора на беднату, саюз з серадняком і рашучая барацьба в кулацтвам» і наколькі арганізацыі гатовы даць рашучы адпор кулацкім элементам і сваім умелым кіраўніцтвам аб'яднаць вакол сябе асноўныя масы селянства: батрацтва, беднату і серадняцкую масу. Канфэрэнцыя заклікае ўсю арганізацыю Менскае акругі ўжыць рашучыя захады да ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі ў галіне выбараў саветаў.

Пытаньні далейшага ўзмацненьня арганізаванасьці і палітычнай актыўнасьці беднаты, узмацненьне саюзу з серадняком і рашучая барацьба з кулаком зьяўляюцца важнейшымі нашымі задачамі. Канфэрэнцыя прапануе ўсёй партарганізацыі ўстанавіць большую сыстэму ў працы з беднатой як па пытаньні скліку агульных сходаў беднаты, гэтак і па пытаньнях працы груп беднаты. Канфэрэнцыя даручае акругкому і РК КП(б)Б ужыць рашучыя захады да паляпшэньня колькасьці груп беднаты і якаснага паляпшэньня зьместу іх працы, стварыўшы в беднаты і батрацтва сапраўдны актыў вакол парт'ячэек, савецкіх і грамадзкіх арганізацый вёскі.

Выбары саветаў у горадзе маюць вялікую палітычную значнасьць як у сэнсе большага ўцягненьня шырокіх рабочых колаў у палітычнае і гаспадарчае жыцьцё краіны, гэтак і ў сэнсе ажыўленьня работы саветаў; неабходна, каб рабочая кляса правяла максымум арганізаванасьці і сьвядомасьці. Гэта неабходна тым больш, што вопыт мінулай выбарчай кампаніі паказаў значны рост актыўнасьці дробна-буржуазных колаў. Канфэрэнцыя заластрае ўвагу ўсёй арганізацыі і прафсаюзаў на неабходнасьць прыняць належныя захады, каб было 100 проц. удзельнічаньне рабочых і работніц у выбарах саветаў, для чаго зараз-жа разгарнуць справаздачную кампанію аб працы гарсаветаў і падрыхтоўку да самых выбараў.

Адзначаючы недастатковую працу шэфскіх арганізацый, адсутнасьць плянавасьці і сыстэмы ў гэтай галіне, канфэрэнцыя прапануе ўстанавіць больш сыстэматычную працу шэф-арганізацый, дабіўшыся ўцягненьня ў гэту працу больш шырокіх колаў рабочых, паляпшэньня масавай працы, палепшыўшы кіраўніцтва працай гэтых арганізацый з боку ячэек, райкомаў і АК КП(б)Б.

Прымежнасьць нашай акругі, абвастрэньне ваеннай небясьпекі патрабуюць ад усёй нашай партарганізацыі больш напружанай працы па падрыхтоўцы партыйнай і камсамольскай арганізацый, а таксама рабочых і работніц да вайсковых ведаў і большага падтрыманьня Чырвонай арміі. Неабходна, каб партыйная арганізацыя цалкам і асобныя ячэйкі ўстанавілі больш шчыльную сувязь з Чырвонай арміяй. Палепшыць працу на шэфстве над Чырв. арміяй, сатаварыство паміж гранадзянскімі і вайсковымі арганізацыямі, больш увязаць працу паміж клубамі і дамамі Чырвонай арміі, больш шырока разгарнуць працу ТДА-Авіях. і Чырвонага Крыжу, устанавіўшы больш плянавасьці і сыстэмы ў іх працы, уцягнуўшы ў іх шырокія рабочыя колы.

Канфэрэнцыя лічыць неабходным зьвярнуць увагу партарганізацыі на ўзмацненьне дапамогі як па лініі дапамогі тэрчасьцям у правядзеньні абораў пераменнага складу, да прызыўнадрыхтоўкі, міжборнай працы, гэтак і па лініі ўдзелу у вайскова выхаваўчай працы пераменьнікаў і дапрызыўнікаў, вывучаючы сацыяльны склад апошніх, ліквідацыі няпісьменнасьці, шырэй скарыстоўваючы актыў тэрытарыяльнікаў на грамадзкай працы.

Выходзячы з таго, што да сучаснага моманту пытаньне высоўваньня рабочых-партыйцаў і беспартыйных яшчэ ня мае належнага напрамку, канфэрэнцыя прапануе партарганізацыі, прафсаюзам узяць курс на больш рашучае высоўваньне рабочых на аказваную працу і аказаньне належнай дапамогі ў іх працы, адначасова в гэтым палепшыць працу па аказаньні дапамогі вынаходніцтву як на своечасовым разглядзе вынаходзтва, гэтак і больш шырокага прыняцьця яго ў вытворчасьці.

Працы делегацкіх сходаў павінна быць удзелена сур'ёзная ўвага. Неабходна падабраць сталы склад добра падрыхтаваных кіраўнікоў для кіраўніцтва працай гэтых сходаў. Асаблівую ўвагу ўсёй партарганізацыі трэба зьвярнуць на сыстэматычнае і рашучае высоўваньне жанчын на агульнакіруючую працу. Неабходна больш уцягнуць жанчын у савецкія, гаспадарчыя, прафэс. і партыйныя арганізацыі. Таксама патрэбна ўзмацніць працу па ўцягненьні работніц у партыю.

У зьвязку з перажываемымі цяжкасьцямі, зьвязанымі з ростам сацыялістычных элементаў як у горадзе, гэтак і ў вёсцы, пытаньне правільнага кіраўніцтва партыі камсамолам набывае асабліва важнае значэньне, таму канфэрэнцыя прапануе ўсёй партарганізацыі: а) зьвярнуць асаблівую ўвагу на большавіцкае выхаваньне камсамольскай арганізацыі, б) дабіцца правільнага партыйнага кіраўніцтва ЛКСМ, асабліва в боку ячэек, в) павесьці ўзмоцненую працу з актывам ЛКСМ, паняўшы дысцыпліну сярод яго, г) павесьці рашучую барацьбу з хваравітымі зьявішчамі ў камсамольскай арганізацыі (п'янства, недысцыплінаванасьць, упадніцтва і г. д.), д) павялічыць рост арганізацыі ЛКСМ за кошт рабочай, батрацка бяднацкай моладзі, е) узмацніць працу партасяродку ў ЛКСМ, ж) палепшыць працу сярод піянэраў, з) праверыць, як прапуюць прымацаваныя да камсамольскіх ячэек партыйцы і прыняць належныя захады да палепшаньня іх працы.

Адзначаючы вусім слабую працу па правядзеньні антырэлігійнай працы, у зьвязку з чым мы маем некаторы клерыкалізм, канфэрэнцыя ставіць перад усёй партарганізацыяй задачу на бліжэйшы перыяд неабходнасьці ўзмацненьня антырэлігійнай прапаганды ў штодзённай сваёй працы, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на барацьбу з клерыкалізмам, рэлігійнымі абрадамі як у партыйнай і камсамольскай арганізацыях, гэтак і сярод беспартыйных мас.

Адзначаючы слабое асьвятленьне становішча працы райёнаў у друку і недастатковае распаўсюджаньне газ. «Зьвязда», канфэрэнцыя прапануе РК і ячэйкам прыняць належныя захады да большага асьвятленьня становішча і працы партарганізацый на старонках цэнтральных газэт, прыняўшы крокі да пашырэньня падпіскі на газ. „Зьвязда". Разам з гэтым канфэрэнцыя лічыць неабходным, каб газ. „Зьвязда" палепшыла вымест газэты наогул і партыйнага аддзелу—у прыватнасьці.

У Саюзе ССР.

ЯК КУЛАКІ ЛУДАРВАЮ ТЭРАРЫЗАВАЛІ БЕДНАТУ.

ПАКАЗАНЬНІ СЬВЕДАК НА ПРАЦЭСЕ ЛУДАРВАЙЦАЎ.

ІЖАЎСК. 22-га сьнежня перад судом прайшлі галоўныя абвінавачаныя. Кожнае новае паказаньне высьвятляе клясавую сутнасьць Лударвайшчыны, сведкі-бядняцкі Цыгінёвай кулакі ня раз награжалі расправаю за тое, што яна сябра таварыства.

Сьведка Міхайлаў, які быў адпушчаны, заўважае, што арганізатары лупцоўкі Іванаў і Сергеяў служылі ў Калчака.

Ягораў паказвае суду: заможнікі запужалі нас нагрозамі, яны прымушалі нас згаліцца на лупцоўку, якую распачалі Крылаеў і Сергеяў.

Лушнікоў заўважае, што клясавая барацьба ў Лударваі абвастрылася ў 1925 годзе, калі бяднацкая частка асабліва дамагалася перадзелу, якому перашкодзілі заможнікі. Проці перадзелу паўставалі абвінавачаныя Сергеяў, Мамятаў, Тычкін і Пятроў. Сьведка паведамляе падрабязнасьці забойства у 1921 г. у Лударваі камуністаў і зазначае на асоб, якія ўдзельнічалі ў гэтай расправе. Сьведка паказвае, што на сходзе, калі трэба было правесьці самаабкладаньне, супярэчылі кулакі. Увесь цяжар падатку перакладаўся на плечы беднаты. Беспартыйны настаўнік Шутаў паказвае, што беднота ў Лударваі была пад прыгонам, лепшую зямлёю ўладалі кулакі. Сходы беднаты склікаліся тайком уночы.

Паказаньні Хвёдарава выяўляюць, што набываньне і продаж зямлі ў Лударваі—частае зьявішча. Кулак Міхайлаў займаецца сыстэматычным набываньнем зямлі ад беднякоў. Суд ухваліў паведаміць абласной пракуратуры пра гэты факт для расьсьледаваньня.

Каляд рабочыя не сьвяткуюць.

СЭВАСТОПАЛЬ, 26-XII. Усе заводы, фабрыкі і прадпрыемствы працавалі поўнасьцю на першы і другі дзень каляд. Большая частка заработку перадаецца на набудову помніка Леніну. Газэты выходзілі.

* * *

ЧАЛЯБІНСК. Рабочыя заводу імя Калюшчанкі, чыгуначы і служачыя шмат-якіх устаноў не сьвяткавалі каляд.

* * *

ОМСК, 26-XII. Напярэдадні каляд школьнікі і піянэры чыгуначнае ваколіцы Ленінскае наладзілі антыалкагольную дэманстрацыю; накіраваўшыся да галоўных майстэрняў. Рабочых, якія выходзілі з працы, дзеці сустракалі словамі: «Татка, ня пі, ідзі дадому».

* * *

ВАЛОГДА. 27-XII. Рабочыя Сухонскіх фабрык, чыгуначнікі і рабочыя ўсіх іншых прадпрыемстваў губерні адмовіліся сьвяткаваць каляды. Дні адпачынку перанесены на 1-2-3 студзеня.

АГІТАЦЫЙНЫ ПРАБЕГ МАСКОЎСКІХ ЛЫЖНІКАЎ.

МАСКВА Раніцою 25 га сьнежня на стадыёне імя Томскага адбыўся фініш 4-га губэрскага зорачна-лыжнага прабегу. Больш 3 000 чалавек з усіх паветаў і валасьцёў Маскоўскае губэрні ўзялі ўдзел у лыжным паходзе, мэтаю якога было ня толькі дэманстрацыя фізычнае трываласьці, але, пераважна, перадвыбарчая агітацыя. Удзельнікі паходу наведалі больш 2 000 вёсак і насельных пунктаў, дзе праводзілі гутаркі і агітавалі сялян за актыўны ўдзел у перавыбарчай кампаніі. Поруч з гэтым, лыжнікі дастаўлялі ў хаты-чытальні і сельсаветы перадвыбарчую літаратуру і плякаты.

Масква прыхільна сустрэла агітатараў на лыжах. Каманды лыжнікаў сустракаюцца гучнымі «ура» і гукамі аркестру.

Увечары ў цэнтральным доме Чырвонае арміі адбыўся ўрачысты сход, прысьвечаны ўдзельнікам лыжнага прабегу. З прывітальнымі ўдзельнікам лыжнага прабегу выступалі прадстаўнікі грамадзкіх і савецкіх арганізацый. Вечар скончаўся канцэртам.

* * *

АРЭХАВА-ЗУЕВА. Анґэтуль выйшла ў агітацыйны прабег 450 лыжнікаў. Мэта прабегу—правесьці на вёсках агітацыйную працу ў зьвязку з перавыбарамі саветаў.

ВЯЛІЧЭЗНЫ РАЗЬЛІЎ СЫР-ДАР'І.

ЗАТОПЛЕНА ШМАТ АВУЛАЎ.

КІЗЫЛ-АДРА, 24 12. У райёне Чыйлі рочка Сыр-Дар'я з-за затораў на працягу 50 кілёмэтраў разьлілася ад 5-ці да 15-ці кілёмэтраў у шырыню. Разводзьдзе пакрываецца мерзлаю лёдавою кашаю, стварэцца новыя заторы, вада прабывае, рочка прарывае новае логва: заліта вадою блізка 10-ці аўлаў. У пасёлак Чыйлі пасланы атрад чырвонага крыжу, санітарны атрад, а таксама чырвонаармейцы. Туды пасланы мука, абрыбанком аб вясьціў працоўную і гужавую павінасьць для дапамогі залітым вадою райёнам.

Вада падышла да Арсалінскае дамбы і хлынула праз яе. Праца дзеля адваўленьня разьмытае дамбы праводзіцца сіламі чыгуначнікаў і мабілізаванага жыхарства. Сёньня дамба будзе адноўлена. Падрыўнікі ня маюць сілы знагацца з ледаставам. Жыхарства залітых вадою аўлаў выратоўваецца на выспах.

Абсталяваньне для Азнафты будуецца на нашых заводах.

БАКУ, 27.XII. Большая частка заказаў на абсталяваньне нафтавае прамысловасьці на 1928 29 г. перадана савецкім заводам. Сёлета перадана заводам савецкае прамысловасьці заказаў на рознае абсталяваньне для бакінскіх нафтавых промыслаў Азнафтабуду на 54 міліёны рублёў; гэта значна перабольшвае агульную суму заказаў, перададзеных савецкім заводам летась. Імпортныя заяўкі на абсталяваньне, у зьвязку з гэтым, значна скарочаны. Заказы Азнафты разьмешчаны, пераважна, між Сормаўскім, Калёменскім і Бранскім заводамі.

Усесаюзны зьезд астраномаў.

ЛЕНІНГРАД. 23-га сьнежня адчыніўся ўсесаюзны зьезд астраномаў пад старшынствам прафэсара Казанскага Унівэрсытэту Якаўкіна. Ганаровым старшынёю абраны прафэсар С. Д. Глазэнап. На зьезд прыехала блізка 100 делегатаў з Масквы, Кіеву, Мікалаеву, Іркуцку, Тулы, Крыму, Харкаву і іншых гарадоў СССР. Сярод прыехаўшых на зьезд—самыя выдатныя вучоныя Саюзу—Н. Н. Гарачоў, С. Н. Блажко, С. К. Арлоў, Г. Г. Сесінкоў і інш. Праца зьезду працягнецца 7 дзён.

16 бажніц пад школы.

УРАЛЬСК, 21-XII. У Азгірскім і Каравубінскім райёнах Уральскае акругі (Казакстан) агульны сход жыхарства па ініцыятыве камсамольцаў ухваліў перадаць пад школу 16 бажніц (мячэтаў).

БАЙКІ І СПРАВЫ.

«Правда» ў артыкуле «Легенды и дела» піша:

Падпісаны эканамічныя згоды між СССР і Нямеччынаю. Гэтыя згоды датыкаюцца практычных пытаньняў гаспадарчых адносін між СССР і Нямеччынаю і, бясспрэчна, вызначаюцца станоўчым фактарам разьвіцьця міжнародных сувязей Савецкага Саюзу.

Разам з тым, гэтыя згоды спаткалі вельмі спрыяючыя водгукі ў Нямеччыне. Буржуазная преса часта прыпісвае савецкаму ўраду схільнасьць захапляцца нерэальнаю палітыкаю, „неадступнымі ідэямі" і іншымі «камуністычнымі выдумкамі". Такія выбрыкі па адрасе СССР у значнай меры тлумачацца тым, што разнах і мэты палітыкі савецкае дзяржавы часта ляжаць за межамі палітычнага кругазіду буржуазных палітыкаў-борзапісцаў. Між тым, замежная палітыка савецкае дзяржавы зьяўляецца ня толькі насьцелем і праваднікам ідэй гістарычнага значэньня, але і зброяй штодзённае барацьбы і дзелавога вырашэньня задач, якія высоўнае перад намі жыцьцё. Дзелавое палітыкі і сур'ёзных плянаў мы, зразумела, не назбаўлены. Мы зацікаўлены ў разьвіцьці гаспадарчае сувязі з сусьветным рынкам, мы хочам гандляваць з акаляючымі нас капіталістычнымі дзяржавамі. Мы в поўнаю адкрытасьцю гатовы дзелавым парадкам абмяркоўваць пытаньні, зьвязаныя з разьвіцьцём гаспадарчага абароту між Савецкім Саюзам і капіталістычным сьветам. Мы гатовы весьці дзелавую гутарку з нашымі контрагентамі пры адной абавязковай умове—пры ўмове поўнага прызнаньня сучаснае нашае сацыяльнае і эканамічнае сыстэмы, у асобку, безагаворачнага прызнаньня асноўнага закону савецкае дзяржавы—манаполіі замежнага гандлю.

Імкненьне гісторыі ўзаемадачыненьняў СССР з Нямеччынаю ведае прыклады, да якіх плённых вынікаў могуць прывесьці перагаворы на такой базе: адным з гэткіх прыкладаў можа зьвіцца ўтвораны ў 1925 годзе вялікі савецка-нямецкі гандлёвы ўгавор.

Для Нямеччыны ўтвораная згода будзе мець у кожным разе ня меншае значэньне, чымся для СССР. Замежная палітыка Нямеччыны за апошні год далёка не багата рэальнымі дасягненьнямі. Тое, што нямецкая буржуазія да апошняга часу лічыла посьпехам нямецкае палітыкі, зараз пераацэньваецца. Заходняя арыентацыя Нямеччыны ня можа паказацца станоўчымі вынікамі. Дзелавое ўмацаваньне эканамічных сувязей між СССР і Нямеччынаю можа быць процістаўлена „легендарным посьпехам" нямецкае «заходняе арыентацыі». Яно разам з тым руйнуе шкадлівыя легенды пакоят непасрэдных савецка-нямецкіх адносін.

Весь яны, некаторыя вынікі эканамічных перагавораў між СССР і Нямеччынаю. Яны сьведчаць, якія насьледкі можа даць для абедных бакоў дзелавы падыход да разьвіцьця эканамічных узаемадачыненьняў. Чым хутчэй гэта зразумеюць гаспадарчыя колы ў іншых краёх Эўропы і Амэрыкі, тым лепш будзе для іх. Даўно час зразумець, што спэкуляцыя на антысавецкіх легендах—праца ня вельмі ўжо прыбытковая.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ.

Зьезд польскай вайсковай фэдэрацыі.

27 сьнежня г. г. у Познані адбыўся зьезд вялікапольскіх паўстанцаў.

У фэдэрацыю польскіх вайсковых арганізацый прынятыя яшчэ тры арганізацыі, так што цяпер лік аб'яднаных вайсковых арганізацый раўняецца 19.

Права пабыту чужаземцаў у Польшчы.

У хуткім часе ў Польшчы будзе выданы загад аб праве пабыту ў Польшчы чужаземцаў. Загад гэты прадбачыць два роды пабыту: 1) часовы да 2 гадоў і 2) звыш 2 гадоў.

Аб прыезьдзе на часовы пабыт будуць пастанаўляць консулы без параўнаньня, як да гэтай пары, в цэнтральнай уладай, што прысьпешыць атрыманьне дазволу.

Аб выезьдзе на пабыт звыш 2-х гадоў будзе пастанаўляць ваявода, калі чужаземец прыедзе.

Украінскае школьніцтва ў Галіцыі.

У Галіцыі маецца цяпер 4668 пачатковых школ; з іх польскіх—954, украінскіх—646, польска-украінскіх—1675, польскіх в польскай мовай, як прадметам,—1292. Лік настаўнікаў у 1928-29 г. раўняўся: палякаў—8727, украінцаў—3123; агулам—12173.

Школьніцтва на польскай Валыні.

На Валыні маецца дзяржаўных школ: польскіх—375, украінскіх,—15, польска-украінскіх — 417, польскіх в украінскай мовай, як прадметам,—348. Прыватных школ маецца: польскіх—6, украінскіх—2, польска-украінскіх—2, польскіх в украінскай мовай, як прадметам—1.

Падзел люднасьці ў Польшчы паводле заработкаў.

В. Тыціпскі ў «Эпосе» (№№ 327 і 379) аблічае падзел люднасьці Польшчы паводле яе даходаў у 1927 г. Аказваецца, што ў Польшчы зарабляюць ніжэй мінімуму існаваньня, г. ё. менш 150 злотых,—82,2 проц. Ад 150 да 1000 зл. зарабляе 18,77 пр.; вышэй 1000 зл.—0,39 проц. Прыведзеныя лічбы сьведчаць аб вельмі цяжкай гаспадарчай рэчаіснасьці.

Камуністычныя адозвы.

Уноч на 21 сьнежня ў розных пунктах Малапольшчанскага павету было раскідана шмат адозваў райкому КПЗБ.

Ваўкі ў Беластоцкім пав.

«Газ. Варшавска» паведамляе, што ў Беластоцкім пав. зьявілася шмат ваўкоў, якія нападаюць жыцьцю сялян і прыносяць вялікую шкоду.

Падзеі ў Аўганістане.

АНГЕЛЬСКІЯ САМАЛЁТЫ ВЫВОЗЯЦЬ ЧУЖАЗЕМЦАЎ.

ЛЁНДАН, 26-XII. Агэнцтва Рэйтэра паведамляе: Ангельскія вайсковыя самалёты прыляцелі ў Пэшавар і прывезьлі другую групу чужаземцаў, якія жадалі пакінуць Кабул. У гэтую групу ўваходзяць члены 20-ці сем'яў.

ПРАВАКАЦЫЯ РУМЫНСКАЕ АХРАНКІ

ВЕНА, 24-XII. Румынскія газэты паведамляюць, што ў бэсарабскай мясцовасьці Нзод выкрыт тайны склад зброі з вялікаю колькасьцю выбуховых рэчаў, куляметаў, вінтовак і амуніцыі. У зьвязку з гэтым арыштавана 4 асобы.

Сігуранца паведамляе, нібыта склад належаў падпольнай камуністычнай арганізацыі, якая знаходзіцца ў Балце.

На думку левых апазіцыйных колаў, выкрыцьцё «тайнага складу зброі» наладжана сігуранцаю, каб даць прычэпку ўраду Маніу скасаваць „мякі курс", уведзены ў Бэсарабіі ў часе выбараў, і адначасова сыстэму асаднага становішча і жандарскага тэрору.

У ФРАНЦЫІ ПАЧАЛАСЯ СТАЧКА ГАРНЯКОЎ

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА ГАРНЯЦКАГА ПРАФСАЮЗУ.

ПАРЫЖ, 26-XII. Распачалася назначаная ўнітарным прафсаюзам гарнякоў на 26-га сьнежня забастоўка гарнякоў Сэнт-Эцьену. Бастуючыя патрабуюць павялічыць заработак на 5 франкаў у дзень для ўсіх катэгорый. Уласьнікі капальняў адхілілі гэтае патрабаваньне, спасылаючыся на залішні здобыч

10 год яўрэйскага камуністычнага друку.

На варце кастрычнікавых заваёў.

Дзесяць год яўрэйскі камуністычны друк цьвёрда стаіць на варце кастрычнікавых заваёў. Дзесяць год гэты магутны арганізатар яўрэйскіх працоўных мас праводзіць упартую работу ў справе іх інтэрнацыянальнага пралетарскага выхавання.

У першыя гады існавання БССР, калі ў краіне кіпеў бандытызм і перад усёю нашай партыяй стаяла актуальнейшая задача — абарона краіны, узмацнення дыктатуры пралетарыяту яўрэйскі камуністычны друк даваў магутнае яўрэйскаму пралетарыяту на барацьбу з з контр-рэвалюцыйнымі сіламі, якія стараліся задушыць і затапіць у крыві нашу рабочую дзяржаву. Дапамагаючы гэраізму ўсяго пралетарыяту БССР у саюзе з асноўнымі масамі сялянства пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, вораг быў разьбіты, і мы атрымалі магчымасьць кінуць на фронт гаспадарчага і культурнага будаўніцтва вялізарныя творчыя пралетарскія сілы. Савецкая ўлада і камуністычная партыя атрымалі магчымасьць разгарнуць у нашай краіне сацыялістычнае будаўніцтва.

Але разьбіць ворага рэвалюцыі мала яго трэба дабіць. Вось у такім кірунку яўрэйскі камуністычны друк выхоўвае яўрэйскую рабочую клясу і працоўных: з аднаго боку, ён уздымае іх, запальвае энтузіазм да будаўніцтва сацыялізму, самай найвышэйшай формы чалавечага абшчажыцьця—камунізму, і з другога боку яўрэйскі камуністычны друк вучыў яўрэйскі пралетарыят у сваёй штодзённай рабоце безьлітасна біць ворага, у якіх бы формах ён ні праяўляўся, праз які-б шчыліны ён ні прасоўваў сваю галаву.

Роля яўрэйскага камуністычнага друку важна асабліва цяпер, у перыяд рэканструкцыі нашае народнае гаспадаркі, у перыяд будаўніцтва сацыялізму, у перыяд, калі асабліва патрэбен творчы энтузіязм рабочае клясы і працоўных. Роля камуністычнага друку важна ў галіне ўцягненьня ў сацыялістычнае будаўніцтва раней прыгнечаных, бяспраўных, пазбаўленых магчымасьці займацца прадукцыйнай працай шырокіх яўрэйскіх мас.

Многа слаўных старонак, поўных бяспрыкладнага гэраізму і адданасьці справе рабочае клясы яўрэйскі камуністычны друк запоўніў ў гісторыю барацьбы рабочае клясы СССР за дыктатуру пралетарыяту, за будаўніцтва сацыялізму у нашай краіне.

Місія яўрэйскага камуністычнага друку ў БССР яшчэ не закончана, як незакончана гістарычная рэвалюцыйная місія ўсяе рабочае клясы СССР.

Пасылаючы свае гарачае пралетарскае прывітаньне яўрэйскаму камуністычнаму друку і яго працаўнікам, мы глыбока пераконаны, што ў далейшым ёе будзе таксама моцна стаяць на варце абароны кастрычнікавых заваёў, за узмацненьне дыктатуры пралетарыяту, за пабудову сацыялізму ў нашай краіне. Яўрэйскі камуністычны друк і ў далейшым будзе таксама пасьпяхова выхоўваць новыя кадры барацьбітоў за ўсясьветны Кастрычнік.

А. Хацкевіч.

Урачыстае пасяджэньне прысьвечанае 10-годзьдзю.

26-га сьнежня ў клюбе Карла Маркса адбылося ўрачыстае пасяджэньне, прысьвечанае 10-цігодзьдзю яўрэйскага камуністычнага друку. У прэзідыум сходу былі запрошаны т. т. Стасевіч, Славінскі, Ашаровіч, Агурскі, яўрэйскі пісьменьнік А. Рэйзін, рабочы МБВ т. Сарока, супрацоўнікі газэты „Акцябр", рабкоры газэт.

Адчыніў сход т. **Ашаровіч.**

— Сьвята 10-цігодзьдзя яўрэйскага камуністычнага друку БССР,—зазначыў прамоўца,—гэта сьвята ўсяе партыі, сьвята працоўных мас. Яўрэйскі камуністычны друк у працягу цэлага дзесяцігодзьдзя выхоўваў яўрэйскія працоўныя масы на змаганьне са згодніцкімі, меншавіцкімі поглядамі, на змаганьне за дыктатуру пралетарыяту.

Але мы не павінны спыніцца на гэтых дасягненьнях. Мы ўмелі ўладу ў свае рукі тая дзеля таго толькі, каб давіце свайго дабрабыту; перад намі стаіць задача вызваліць ад капіталістычнага ярма пралетарыят усяго сьвету, а гэта можа зрабіць вольнае бальшавіцкае слова.

ПРАМОВА Т. СТАСЕВІЧА.

Ад імя ЦК КП(б)Б вітаў сход т. **Стасевіч.**

Яўрэйскі камуністычны друк у працягу гэтых 10 год прайшоў слаўны шлях ад «Штэрна» да «Акцябра». За гэты час яўрэйскі друк вёў рашучую барацьбу за дыктатуру пралетарыяту, за інтэрнацыянальнае выхаваньне яўрэйскіх працоўных мас, за вызваленьне іх ад уплыву згодніцкай прэсы «Бунда», «Поалей-Цыён» і інш. Яўрэйскі камуністычны друк дапамагаў уцягваць у сацыялістычнае будаўніцтва яўрэйскія працоўныя масы. Пажадаем жа, — казаў прамоўца, — яўрэйскаму камуністычнаму друку і надалей стаяць на варце за дыктатуру пралетарыяту і надалей высока трымаць сьцяг ленінізму. Я пажадаю, каб яўрэйскі камуністычны друк і далей вёў рашучую барацьбу з антысэмітызмам з аднаго боку і з шавінізмам розных нацыянальнасьцей—з другога.

ПРАМОВА Т. СЛАВІНСКАГА.

Ад імя Менскага акругкому КП(б)Б выступіў сэкратар акругкому т. Славінскі.

— 10-цігодзьдзе, прведзенае яўрэйскім камуністычным друкам, адзначыў т. Славінскі, зьяўляецца вялікім сьвятам. Яўрэйскі камуністычны друк у БССР адыграў вялікую ролю ў замацаваньні дыктатуры пралетарыяту. Ня гэта праводзіць згодніцкі, бундаўскі апрацоўкі ў Польшчы, які дапамагае замацаваньню пазіцый фашызму, што паслабляе адзінства рабочае клясы.

Камуністычны друк у нас выкрыў усю згодніцкую палітыку дробна-буржуазных партый, ён выкрыў «прыяцеляў» яўрэйскай вуліцы. Але ваш шлях яшчэ не закончаны, трэба і надалей працягваць барацьбу за чыстату ленінізму.

Рабочы МБВ т. **Сарока** вяклікае яўрэйскі камуністычны друк і надалей весьці рашучую барацьбу з антысэмітызмам і з шавінізмам розных масьцей і напрамкаў.

Т. т. **Агурскі, Нахімовіч** і інш. выступалі з успамінамі аб тым, як нарадзіўся яўрэйскі камуністычны друк у Беларусі, як цяжка было на першых часах выдаваць камуністычныя газэты, ня маючы ні адпаведных працаўнікоў, ні патрэбнага шрыфту.

Яўрэйскі пісьменьнік А. Рэйзін расказаў, як цікавяцца ў Амэрыцы газэтай «Акцябр». Яўрэйская амэрыканская камуністычная газэта „Фрайгайт" цалкам перадрукоўвае артыкулы з «Акцябра».

Газэта „Акцябр" —сказаў Рэйзін,— шырока адбівае грамадзкую думку.

Пасьля ўрачыстай часткі адбыўся канцэрт.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Адчынілася акрпартканфэрэнцыя.

Ворша, 27-XII. Адчынілася акруговая партыйная канфэрэнцыя.

Перад канфэрэнцыяй стаіць шэраг сур'ёзных пытаньняў, як, напр.,— даклад ЦК КП(б)Б, даклад ЦКК КП(б)Б., справаздача АК КП(б)Б і садаклад рэвізійнае камісіі, справаздача АКК КП(б)Б і апошняе—даклад „Становішча і перспэктывы разьвіцьця прамысловасьці і сельскае гаспадаркі акругі".

Тав. Віленстовіч, сэкратар акруговаму партыі, пры адчыненьні канфэрэнцыі сказаў:

— Канфэрэнцыя праз гарніла самакрытыкі правярыць працу акруговае партарганізацыі і вызначыць шляхі для ўзмацненьня калектывізацыі сельскае гаспадаркі і індустрыялізацыі краіны.

— Канфэрэнцыя будзе працаваць пад знакам яшчэ больш непрымірымае далейшае барацьбы з ухілам ад генэральнае лініі партыі, у першую чаргу з правым ухілам і прымірэнчествам да яго, пад знакам барацьбы за ідэалёгічную чыстату нашае партыі, за ідэйнае ўзбраеньне партыйнае арганізацыі, за ленінізм.

Раённая нарада па падвышэньні ўраджайнасьці.

(Узьдзенскі раён, Менскае акругі).

У нядзелю 9 сьнежня г. г. ў м-ку Ўзьдзе склікана была нарада па абгаварэньню пытаньня аб падвышэньні ўраджайнасьці.

На нараду былі скліканы перадавыя сяляне земляробы са ўсіх канцоў раёну, кіраўнікі савгасаў, камуны «Сяўбіт», арцеляў, лепшыя з настаўнікаў, якія працуюць на сваіх школьных вучастках і практычнай працай дапамагаюць падняцьцю ўраджайнасьці і прыбытковасьці сялянскай гаспадаркі. На нарадзе прысутнічалі яўрэй-земляробы, якія надаўна сталі земляробамі, прадстаўнікі дробных сельска-гаспадарчых і садова-гародных калектыўных гаспадарак. Увогуле на нарадзе прысутнічала каля ста асоб са ўсіх куткоў раёну.

Галоўным пытаньнем нарады было абгаварэньне мера рэпёмстваў савецкай улады па падвышэньню ўраджайнасьці сельскай гаспадаркі.

Пытаньне падвышэньня ўраджайнасьці вельмі цікавіла нашых перадавых культурных гаспадароў, бо ў спрэчках яны прымалі актыўны ўдзел і правільна абмяркоўвалі высунутыя прапановы і мерапрыёмствы. Сяляне земляробы выказаліся, што ўсе высунутыя мерапрыёмствы вельмі своечасовы і неабходны.

Выказваліся думкі сялян-перадавікоў аб тым, што для вайбольш пасьпяховага правядзеньня мерапрыёмстваў па падвышэньню ўраджайнасьці неабходна арганізацыя сялян-земляробаў у калектывы і арцелі для сумеснай апрацоўкі зямлі, дзе лягчей можна будзе праводзіць гэтыя мерапрыёмствы.

Дзядзька Валожын сказаў, што сяляне разумеюць выгаду калектыўнай апрацоўкі зямлі, разумеюць, што толькі пры калектыўнай апрацоўцы можна хутчэй пазьбавіцьцо ўраджай, паболышыць прыбытковасьць гаспадаркі і палепшыць наш дабрабыт, але сяляне ня ў ліку ўжо бяднота.

Кіраўнік адзінай у раёне камуны «Сяўбіт» тав. Пятроўскі сказаў, што бяцца арганізоўвацца ў арцелі і камуны ня трэба. Ён прыводзіў прыклады з жыцьця сваёй камуны, як яна арганізавалася, як паступова расьце і мацнее і як палепшаецца дабрабыт яе сяброў.

Калі пытаньне землеўпарадкаваньня вёскі, пытаньне палвышэньня ўраджайнасьці навозіць сялян на думку арганізацыі калектываў, арцеляў і г. к., то гэта гаворыць за тое, што сялянства само разумее неабходнасьць калектывізацыі і само пачынае цікавіцца і абгаварваць гэта пытаньне.

Сельнор.

Нарада па пытаньнях павялічэньня ўраджаю.

Барысаў, 27-12. З студзеня наступнага году склікаецца пашыраная нарада прадстаўнікоў гарсавету, РВК, фабрык і заводаў па пытаньнях збору і разьмеркаваньня попелу на ўгнаеньне.

Справа ў тым, што з прычыны існаваньня на тэрыторыі Барысаўшчыны вялікай колькасьці фабрык, заводаў і інш. прадпрыёмстваў саматужнага характару, збор попелу і скарыстаньне яго дасьць вялікую карысьць сельскай гаспадарцы.

Клябанаў.

Рыхтуемся да вясеньняй пасеўнай кампаніі.

Барысаў, 27-12. У райёне ідзе падрыхтоўка да вясеньняй пасеўнай кампаніі.

РВК прымае ўсе меры для дастаўкі, га задавальненьня насельніцтва насеньнем, машынамі і рознымі ўгнаеньнямі.

У гэтую кампанію арганізавана будзе 10 перасоўчых абоваў у складзе 5 трыераў, 9 сартыровак і 5 ільватрашчотак.

Будуць працаваць 7 стацыянарных пунктаў з 30 машынамі

Гэтыя пункты адсартуюць яравога насеньня звыш 250 тон.

Вынайдена таксама патрэбнасьць насеньня і штучных угнаеньняў для беднейшага насельніцтва. У райён будзе завезена каля 1169 тон рознага насеньня.

Гэтая колькасьць насеньня задаволіць патрэбы райёну.

Да правядзеньня падрыхтоўчай працы прыцягнуты аграномы, настаўніцтва і інш. культурныя сілы вёскі.

Лес беднаце.

(Лядзянскі р., Аршаншчына).

У гэтым годзе даремнага лесанатар'ялу для беднаты райёну адпушчана на 1100 руб., а ў крэдыт на 3500 руб.

Увесь гэты лясны матар'ял разьмяркоўваецца на сельсаветах.

Такім чынам, мы бачым, што лесам беднота забясьпечана поўнасьцю.

Ул. Макаеўскі.

Будуецца дрэваапрацовач- ны камбінат.

ГОМЕЛЬ, 27-XII. Гомельскае аддзяленьне Белдзяржстрою распачало будаўнічыя работы па будаўніцтву дрэваапрацоваднага камбінату ў Новабеліцы пры лесапільні «Колтруд». У бліжэйшы час будуць атрыманы будаўнічыя матар'ялы для патрэб будаўніцтва заводу. Будуць пабудаваны: абезьзы завод, калодачны завод, тафляваная вытворчасьць.

Падрыхтоўка да чарговае кантрактацыі.

Магілеў, 27-12. У чарговую кантрактацыю акрсельсаюз мяркуе асноўную масу валакна-лёну, які належыць да загатовак, атрымаць у парадку кантрактацыі. Арыентыровачны плян па валакну папыраецца да 3000 гэктараў, замест 2 тысяч гэктараў у папярэдні годзе са здачаю да 40 тысяч пудоў валакна.

Збожжавых культур будзе закантрактавана каля 4000 гэктараў.

Каб ня было памылак мінулага году акрсельсаюз разаслаў у райвыканкомы на папярэдне абгаварэньне складзеныя ім лічбы кантрактацыі розных культур.

Дапамагаем палітвязьням.

Барысаў, 27-12. Па райёну разгарнулася кампанія па зімовай дапамозе палітвязьням.

Мяркуецца сабраць па райёну 545 руб. Грошы гэтыя будуць зьбірацца пры шырокім удзеле партыйных і камсамольскіх ячэек.

Адказнасьць за пасьпяховасьць кампаніі ўскладзена на 32 ячэйкі Мопр'у Барысаўшчыны.

Да гэтага часу сабрана 165 руб., якія пераведзены ў цэнтральны фонд.

Кампанія будзе выкарыстана для павялічэньня шэрагаў Мопр'у і ўзмацненьня фондаў дапамогі палітвязьням шляхам розных адлічэньняў, спэктакляў, вечароў і іны. Скончыцца яна 1 лютага 1929 г.

Рабкор.

Пабудуем новыя дамы.

ГОМЕЛЬ, 27-XII. Сьвяткаваньне 10-цігодзьдзя БССР будзе адзначана у Гомелі закладкаю 2 х паварховага дому для рабочых, адчыненьнем каапэрацыйных крам пры жактах, арганізацыяй чырвоных куткоў у буйных таварыствах, адчыненьнем курсаў па дашкольнаму выхаваньню для жонак членаў жактаў, школы для навучаньня жонак рабочых кройкі і шыцьцю. Кватэрны каапэрацыйны саюз, апрача таго, выдаў яшчэ 4100 руб. на ўзмацненьне вядзеньня культурнасьветнае працы сярод членаў жактаў. Саматужна-прамысловы саюз адчыніе гарбарню імя Чарвякова, дзіцячы сад імя 10-цігодзьдзя БССР і арганізуе арцель імя 10-цігодзьдзя БССР.

НОВЫЯ ЎСТАНОВЫ ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ.

Гомель, 24 XII. Інспэкцыя аховы здароўя адчыніе малочныя кухні ў Новабеліцы, Дабрушы і Рэчыцы. У Камарынскім райёне адчыняецца дзіцячая кансультацыя.

Адчыненьне гэтых устаноў прывурочана да сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя БССР.

ДЛЯ ПОЛЬСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА.

Магілеў, 27-12. У нацыянальным польскім Хрыпялеўскім сельсавеце, Магілеўскага райёну, з'арганізавалася крэдытнае таварыства.

Усяго зараз маецца па Магілеўшчыне 54 крэдытныя таварыствы.

ЗЛОЎЛЕНА АРГАНІЗАВАНАЯ БАНДА.

Магілеў, 27-12. Крымінушукам заз трымана ў Магілеве арганізаваная шайка зладзеяў у ліку 5 асоб, якая на працягу 2 месяцаў утварыла 23 кражы ў Магілеве са ўзломам.

Пры вобыску на «кватэры» зладзеяў знойдзена шмат крадзеных рэчаў.

Рэзалюцыя 3-й менскай акруговай канфэрэнцыі груп беднаты

ПА ДАКЛАДУ ТАВ. ЯЦКЕВІЧА «АБ ПЕРАВЫБАРАХ САВЕТАЎ І ЎДЗЕЛЕ БЕДНАТЫ».

Узмацненьне сацыялістычнага будаўніцтва і пашырэньне сацыялістычных элементаў на вёсцы, рашучае і пасьлядоўнае наступленьне на кулацтва, рашучая і пасьпяховая барацьба з кулацкай эксплёатацыяй выклікае ўзмоцненае супраціўленьне супроць палітыкі пралетарыяту і камуністычнае партыі з боку кулакоў, нэпманаў, духавенства і г. д.

Аб гэтым сьведчыць цэлы шэраг апошніх характэрных антысавецкіх падзей, утвораных клясавымі ворагамі (падпалы, забойствы і застрашваньне актывістаў-беднякоў і сераднякоў, антысэмітызм, хуліганства і г. д.).

Вопыт мінулай перавыбарчай кампаніі і ажыўленьне дзейнасьці кулацтва ў сучасны момант гавораць аб тым, што кулакі энэргічна рыхтуюцца да перавыбараў саветаў, да таго, каб правесьці ў саветы свае кулацкія кандыдатуры, у выязку з гэтым сучасная перавыбарчая кампанія набывае вельмі вялікае палітычнае значэньне і будзе праходзіць пры абвостранай клясавай барацьбе.

Выходзячы з гэтых умоў, батрацтва і бядняцтва павінны пропяставіць ажыўленьню дзейнасьці кулакоў—узмацненьне блёку батрацтва і беднаты з серадняцкаю масою сялянства і адзінным фронтам даць рашучы і бязьлітасны адпор кулацтву, якое імкнецца выкарыстаць цяжкасьці нашага сацыялістычнага будаўніцтва і недахопы ў працы мясцовых саветкіх і грамадзкіх арганізацый для аслабленьня саюзу рабочай клясы з асноўнай масай сялянства—батракоў і беднякоў з серадняком.

Разьвіць самую энэргічную працу на найбольшаму прыцягненьню батракоў, беднаты і серадняку на справаздачныя і выбарчыя сходы.

Павесьці рашучую барацьбу з кулацтвам, якое імкнецца шляхам падпалаў, забойстваў запужаць актывістаў-беднякоў і с[illegible] разьвяко́ў, як яўна контр-рэвалюцыйных выступленьнямі нашых клясавых ворагаў.

Нясупынна весьці працу па вылучэньню кулацкіх прыхільнікаў і стаўленіку беднякоў і сераднякоў і навесьці рашучу барацьбу з імі не дапускаючы іх у с[illegible] веты.

Дапамагчы выбарчым камісіям выявіць усіх падлягаючых пазбаўленьню выбарчага правоў і сачыць за тым, каб ні адзін пазбаўлены правоў ня прысутнічаў на сходах.

Справядзачна-перавыбарчая кампанія ці вінна прайсьці пад лёзунгам крытыкі недахопаў і палепшаньня працы с[illegible]таў.

Даць рашучы адпор кулацтву, якое пад лёзунгам самакрытыкі будзе імкнуцца дыскрэдытаваць саветы і клясава-вытрыманых савецкіх працаўнікоў.

Беднота і батрацтва з прыцягненьнем серадняцкага актыву пад кіраўніцтвам ячэек павінна своечасова абгаварыць і [illegible] мецціць усе мерапрыёмствы, зьвязаныя з перавыбарамі с[illegible]таў (абгаварэньне кандыдатур, кандыдатур будучага складу савету і г. д.).

Прыняць усе захады да арганізацыі шырокага прыцягненьня на сходы жанчын батрачак, бяднячак і сераднячак, усяляк садзейнічаючы большаму абраньню жанчын у будучы склад саветаў.

Прыняць актыўны ўдзел у поўным вы сьвятленьні ходу падрыхтоўкі і перавыбараў саветаў як у насьценгазэтах, так і цэнтральным друку.

Канфэрэнцыя заклікае ўсю бедноту акругі да прыняцьця актыўнага ўдзелу ў правядзеньні ўсіх гэтых рашэньняў, да яшчэ шчыльнейшага згуртаваньня навакол камуністычнай партыі, пад кіраўніцтвам якой беднота ў саюзе з серадняком перамо[illegible] кулацтва ў перавыбарчую кампанію і наступова будзе будаваць сацыялізм.

Загатоўкі валакна-лёну палепшыліся.

ЗА ЎВЕСЬ ЧАС ДА 20 СЬНЕЖНЯ ЗАГАТОЎЛЕНА 3600 ТОН ВАЛАКНА.—СЛАБА ЯШЧЭ СТАІЦЬ СПРАВА СА ЗБОРАМ ЗАКАНТРАКТАВАНАГА ВАЛАКНА-ЛЁНУ.

Водлуг апошніх вестак Наркамгандлю, па ўсёй БССР з пачатку компаніі да 20 сьнежня загатоўлена валакна-лёну 3600 тон. У сьнежні месяцы трэба загатовіць 2500 тон валакна-лёну, а за 20 дзён ужо загатоўлена 1700 тон. Такім чынам, у параўнаньні з леташнім годам загатоўка валакна лёну ў цэлым па Беларусі сёлета ідзе здавальняюча. Разам з тым у некаторых акругах справа пакуль што стаіць яшчэ дрэнна. Напрыклад, у Полаччыне за увесь час кампаніі загатоўлена валакна-лёну толькі 143 тоны, што складае значна менш 10 пр. яе гадавога пляну.

Дагэтуль на мясцох усё яшчэ назіраюцца нездаровыя зьявішчы ў загатоўчай працы: не зьліквідаваны яшчэ мэтады прыватнага гандлярства сярод закупшчыкаў сыравіны. Можна прывесьці шэраг прыкладаў, калі два спэцы розных загатоўчых арганізацый ловяць за палу селяніна і пачынаюць падвышаць цаны на лён нібы на аўкцыёне.

Горш стаіць справа са зборам закантрактаванага валакна-лёну: да 1 сьнежня было сабрана па ўсёй сыстэме сельска-гаспадарчай каапэрацыі 320 тон, або 20 проц. таго, што трэба было сабраць ад сялян—кантрактантаў у гэты тэрмін. Да 11-га сьнежня з пачатку кампаніі закантрактаванага валакна паступіла 490 тон, ці 22,2 проц. заданьня на гэты дзень.

Слабы тэмп паступленьня закантрактаванага валакна-лёну тлумачыцца тым, што сельска-гаспадарчая каапэрацыя да другой паловы лістапада ня прымала мер да сысканьня, у прыватнасьці—не перадаваліся ў суд справы на тых асоб, якія кантракты падпісалі, авансы атрымалі, але лёну зусім і ня думалі сеяць. Між тым гэта магчыма было зрабіць яшчэ ў жніўні-верасьні.

Вакол пытаньня кантрактацыі ня была мабілізавана грамадзкая думка. У паасобных сельска - гаспадарчых таварыствах практыкуецца сысканьне выдадзеных авансаў грашыма, што, бязумоўна мае адмоўны ўплыў на здачу закантрактаванага валакна іншымі сялянамі—кантрактантамі, тым больш, што ў некаторых мясцох пры пакупцы лёну сялянамі ад сялян рынкавыя цэны на валакно вы[illegible]эй загатоўчых. Трэба адзначыць і тое, што ў некаторых райёнах узялі няправільны курс на масавае прыцягненьне да адказнасьці няспраўных здатчыкаў лёну. Між тым можна на агульных сходах пайшчыкаў і наогул сялянства зачытваць сьпісы няспраўных здатчыкаў па кантрактацыі, што, бязумоўна, мела-б свой выхаваўчы ўплыў. Да адказнасьці-ж трэба прыцягваць толькі злосных няздатчыкаў валакна, прытрымліваючыся клясавага прынцыпу.

Трэба таксама спыніць атрыманьне замест валакна грошай. Гэта можна дапускаць толькі ў выпадках, калі будзе даведзена, што пасевы загінулі. Кепска тое, што сельсаветы нават і зараз практыкуюць выдачу сялянам справак аб папсаваньні пасеваў лёну. Трэба было гэта зрабіць яшчэ да збору ўраджаю.

Усе даныя для пасьпяховага ходу лёназагатовак і збору закантрактаванага валакна ў наяўнасьці, у лёнаводных райёны завезенае досыць хлеба; не адчуваецца ў гэтых райёнах і недахопу мануфактуры. Толькі больш увагі, і нашы загатоўчыя пляны і заданьне па канкрактацыі валакна-лёну можа быць выканана.

На шляху да пралетарскай рэвалюцыі.

КПЗБ, як кіраўнік рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі.

Маладая, урайшоўшая ў 6-ы год існаваньня камуністычная партыя Заходняй Беларусі, зьдзяйсьніла сваё кіраўніцтва рэвалюцыйным рухам у вельмі трудных і складаных абставінах. Характэрным у разьвіцьці рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі зьяўляецца рэвалюцыйная актыўнасьць, масавасьць і завостранасьць мэтадаў і форм барацьбы асноўнай сялянскай масы, пры адносна паступовым тэмпе рэвалюцыянізаваньня рабочага руху па гарадох.

Побач з тым, рад аб'ектыўных варункаў, як слабасьць буйна-прамысловага пралетарыяту ў Зах. Беларусі пры буйным націску дробна-буржуазнай стыхіі, дзікі белы тэрор, а пры фашызме яшчэ сыстэма подкупу, падачак, дэмагогіі і таксама абставіны ўнутрыпартыйнага парадку, як адсутнасьць глыбокіх бальшавіцкіх традыцый, слабасьць пралетарскага ядра ў партыі,—усё гэта стварае комплекс цяжкіх умоў працы КПЗБ, у якой пачатны ўсёткі ў асноўным захавала свой пралетарскі характар. Бязумоўна, што ўсе гэтыя фактары адмоўна адбіваюцца на дзейнасьці КПЗБ, служылі і служаць затрудненьнямі для партыі ў ажыцьцяўленьні гегемоніі пралетарыяту—яго кіраўнічай ролі ў рэвалюцыйнай барацьбе.

Так, другая канфэрэнцыя КПЗБ, ня гледзячы на слабасьць рэвалюцыйнага руху на гарадох, на адсутнасьць непасрэднай рэвалюцыйнай сітуацыі ў Польшчы, пад націскам партызанскага руху і бунтарскіх настрояў шырокіх сялянскіх мас, трымае курс на непасрэднае ўзброенае паўстаньне. Гэта найгалоўнейшая памылка партыі таго часу выцякала з недаацэнкі рабочага руху, яго кіраўнічай ролі, і з перавышанай сялянскага руху, акрылены надзеяй на хуткае аб'еднаньне з БССР, але недастаткова клясава сьвядомага. Трэці-ж зьезд КПП (у пачатку 1925 году), а ўсьлед за ім і трэцяя канфэрэнцыя КПЗБ (у пачатку 1926 г.) выправілі гэтую памылку, высунуўшы, як генэральную лінію—паглыбленьне рэвалюцыйнага руху ў Зах. Беларусі на аснове бальшавіцкай лініі, давай 3-й канфэрэнцыяй, магчымы былі тыя дасягненьні, якіх дабілася КПЗБ у далейшай сваей дзейнасьці.

Ня гледзячы на жорсткія ўдары дэфэнзывы, якая нясупынна вырывае барацьбітоў з партыйнай арганізацыі, партыя захавала цэлую сувязь з масамі, партыя рэагавала на ўсе важнейшыя палітычныя падзеі ў краі, стараючыся стаць на чале кожнай забастовачнай акцыі, а радам праведзеных кампаній пашырыла свой уплыў на масы. Барацьба супроць так званай зямельнай рэформы, падаткаў, нацыянальнага ўціску, белага тэрору і інш., барацьба, увязаная з канчатковымі камуністычнымі лёзунгамі, умацавала саюз рабочых і сялян і паслужыла партыі для згуртаваньня мас пад яе сьцягам. Наглядаецца значнае ажыўленьне партыйнага жыцьця, укараненьне бальшавізацыі радоў партыі, яе арганізацыйны рост за кошт пралетарыяту.

Аднак, у часе майскага перавароту і ўстанаўленьня фашысцкай дыктатуры Пілсудзкага ЦК і ўся КПЗБ ня здолелі падняцца ў сваёй тактыцы да арганізацыі рашучых актыўных самастойных выступленьняў працоўных мас, але засталіся на папярэдні тактыцы пратэстаў, сходаў, мітынгаў, дэманстрацый і г. д.—наогул, зрабілі разам з усёй КПП груба-аапартуністычную памылку. Карэньні гэтай памылкі ляжалі галоўным чынам у неразуменьні ролі дробнай буржуазеі ў рэвалюцыі сучаснай Польшчы, недаацэнцы ролі пралетарыяту, а таксама неўлуленьні тактыкі партыі ў адносінах да руху дробна-буржуазных мас. У Польшчы магчыма адна з дзьвюх дыктатур—пралетарыяту ці фашызму. Ад сілы кампартыі ці фашызму залежыць, на чыю карысьць будзе дзейнічаць дробна-буржуазная маса, якая самастойнай палітыцы паміж гэтымі двума лягерамі ня можа мець. Аднак, КПП і з ёй КПЗБ не зразумелі ў той час характару фашызму, не найшлі на заваяваньне пад свой уплыў дробна-буржуазных мас.

Для ажыцьцяўленьня і выпраўленьня майскай памылкі ў партыі падняслася дыскусія аб ролі дробнай буржуазеі, аб прыродзе фашызму, парлямэнтарызьме і г. д. З дыскусіі партыя вырасла на цэлую галаву; яна высьветліла рад спрэчных пытаньняў і стварыла палітычны грунт для кансалідацыі ўсёй партыі на аснове ленінізму. Аднак, гэтая ўнутрыпартыйная ідэалёгічная барацьба настолькі разгарэлася, што прыняла формы вострай фракцыйнай барацьбы і толькі дзякуючы ўказаньням Камінтэрну, а таксама пастановам 4-га зьезду КПП і 1-га зьезду КПЗБ фракцыйнай барацьбе быў пакладзен канец, і замацавана адзінства партыі.

Побач з тым КПЗБ павінна была выпрацаваць і ўдакладніць сваю тактыку, бо прыход Пілсудзкага да ўлады паставіў на ўсю веліч пытаньне аб ваеннай небясьпецы, бо ўся палітыка фашысцкага ўраду, якая прывяла да стабілізацыі капіталізму ў Польшчы, увесла рад новых момантаў і працэсаў у сітуацыю краю. У зьвязку з выдаткамі на падрыхтоўку да вайны фашызм узмацніў эксплёатацыю рабочае клясы, капіталістычная рацыяналізацыя, арбітраж, фашызацыя прафсаюзаў, узмоцнены тэрор—вось што прынёс фашызм у справе разьбіцьця рабочага руху. Далейшае павялічэньне рабочага дня, урэзваньне зарплаты, ліквідацыя і тых куртатых сацыяльных заваёў, якія ёсьць, сталі яшчэ больш рэвалюцыянізаваць асноўную масу пралетарыяту.

На вёсцы ўрад сваёй аграрнай, эканамічнай, нацыянальнай і ваеннай палітыкай умацаваў кулацкую праслойку, пры яшчэ большым абядненьні асноўнай масы сялянства. Гэтым урад унёс дыфэрэнцыяцыю ў беларускую вёску і элементы капіталістычнага разьвіцьця ў сельскай гаспадарцы. Адначасова стварыў ілюзію ў некаторых пластох, асабліва ў верхавіны серадняцтва ілюзіі аб магчымасьці палепшэньня быту сялян пры фашысцкай дыктатуры.

Калі пры гэтых складаных абставінах сацыяльнага характару прыняць яшчэ пад увагу, што фашызм пашоў на стварэньне і падтрыманьне беларускіх згодніцкіх, пры адначасовым узмацненьні жорсткага тэрору, што ўсё разам вялікала хістаньні, а нават і адыход у верхавіне радыкальнага руху, дык ясным стане, у якіх цяжкіх умовах падпольная КПЗБ павінна ажыцьцяўляць кіраўніцтва барацьбой рабочае клясы, сялянства і прыгнечаных нацыянальнасьцей. У зьвязку з гэтымі труднасьцямі ў партыі вывяліся рад памылак правага апартуністычнага характару, як палажэньне, «што КПЗБ павінна весьці за сабой па магчымасьці ўсю вёску супроць нацыянальнага ўціску і г. д.», як замена лёзунгу самавызначэньня аж да аддзяленьня буржуазным лёзунгам «нацыянальнае раўнапраўе» і інш.

Зразумела, што характар усіх гэтых памылак і недахопаў, якія выявіліся па лініі рабочага нацыянальна-вызваленчага і сялянскага руху, сьведчаць аб наяўнасьці правай небясьпецы ў КПЗБ. Пры вельмі складаных аб'ектыўных абставінах у фашысцкай Польшчы, у якіх працуе КПЗБ правая небясьпека становіцца асабліва пагражаючай. Вось дзеля таго 1-шы зьезд КПЗБ, які адбыўся ў гэтым годзе, з усёй сілай завастрае ўвагу партыі на барацьбе з правай небясьпекай.

Аднак, дасягненьні за перыяд ад фашысцкага перавароту да 1 зьезду настолькі яскравыя і вялічэзныя, што даюць поўную гарантыю таму, што КПЗБ дасьць рашучы адпор усім хістаньням і ўхілам якога-б яны ні былі характару, і што КПЗБ і далей будзе ісьці на шляху бальшавізацыі сваіх радоў, узмацненьня свайго ўплыву і кіраўніцтва ў рэвалюцыйным руху шырокіх мас. Правільны курс, узяты партыяй яшчэ на 3-й канфэрэнцыі, а цяпер яшчэ больш удакладнены, а менавіта разгортваньне масавай барацьбы каля ўсіх балячак працоўных мас, каб на досьледзе гэтай барацьбы расьсьеўваць ілюзіі, узьнікаючыя ў выніку фашысцкай палітыкі і работы згодніцкіх агентаў фашызму,—курс гэты даў свае дадатныя вынікі. Дзякуючы шырокім кампаніям, праведзеным КПЗБ, усё больш шырокія масы рабочых і сялян уцягваюцца ў актыўную барацьбу на толькі каля часовых эканамічных дамаганьняў, але і каля палітычных кампаній (1 мая, супроць белага тэрору у гадавіны Кастрычнікавае рэвалюцыі і інш.).

За гэты час у цяжкай барацьбе партыя выйшла загартаванай і значна вырасла ідэёва, палітычна і арганізацыйна, стала найбольшай палітычнай сілай у ЗБ, а яе буйная масавая работа пашырыла ўплыў партыі, замацавала саюз рабочых і сялян і салідарнасьць барацьбы працоўных ЗБ, і Польшчы. Толькі дзякуючы кіраўніцтву КПЗБ магутны масавы рацыянальны рух у ЗБ прыняў формы клясавае барацьбы, унёс сацыяльныя моманты ў нацыянальна-вызваленчы рух. Бадай ніводная кампартыя не змагла разгарнуць такога шырока-ахопліваючага працоўныя масы вызваленчага руху, разьвіць чуласьць у масах да рэвалюцыйных лёзунгаў, як гэтага дасягнула за кароткі час КПЗБ, галоўным чынам, сярод сялянскіх мас. Барацьба партыі са згодніцкімі дае яскравыя вынікі, асабліва на вёсцы, дзе «Вызваленьне» і ППС бадай зусім вымыты, а беларускія згодніцкі ўраз-жа ліквідуюцца пры першым націску партыі з нізоў. КПЗБ значна ўзмацніла сваё кіраўніцтва ў эканамічнай барацьбе пралетарыяту, хоць яшчэ адчуваюцца недастатковасьць гэтага кіраўніцтва сярод с.-г. пралетарыяту. З асаблівым посьпехам партыя правяла выбарную кампанію ў цяперашні сойм, у часе якой выявіла сваю маневранасьць і ўмеласьць шпарка мабілізаваць масы. Калі дзейнасьць партыі ў папярэдні перыяд выявіла пашырэньне свайго ўплыву, дык пры выбарах у сойм стала відавочным значнае паглыбленьне працэсу рэвалюцын

НАПЯРЭДАДНІ ПЕРАВЫБАРАЎ САВЕТАЎ.

САЮЗ ПРАЛЕТАРЫЯТУ І СЯЛЯНСКАЙ БЕДНАТЫ З СЕРАДНЯКОМ--АСНОВА МАГУТНАСЬЦІ САВЕТАЎ. БУДЗЕМ УЗМАЦНЯЦЬ ГЭТЫ САЮЗ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЛЕНІНСКАЙ ПАРТЫІ.

НА ДАПАМОГУ ВЁСЦЫ.

Ніколі гарадзкі тэатр не бачыў столькі народу, як сягодня на арганізаваным горсаветам, акрпрафбюро і рэдакцыяй газеты «Камуніст» мітынгу-перакліччы, прысвечанаму перавыбарам савету. Працоўныя Бабруйску прышлі на мітынг, каб сумесна абгаварыць метады лепшага правядзення перавыбарчай працы, вызначыць практычныя мерапрыёмствы на дапамозе ў перавыбарах саветаў вясковаму сялянству ў час абвастрэйшай клясавай барацьбы.

Мітынг вітала делегацыя 5 акруговай партканферэнцыі, ад імя якой т. Вазура сказаў:

Цяпер, як ніколі вёсцы патрэбна дапамога гораду. Усе лепшыя кадры рабочых і сялян павінны быць кінуты ў вёску на дапамогу па перавыбарах саветаў.

Шэраг прадстаўнікоў прадпрыёмств акругі ў сваіх выступленьнях дзяліліся сваімі мерапрыёмствамі па ўжо праведзеных практычных начынаньнях у справе лепшага правядзеньня перавыбараў у горадзе і дапамогі ў перавыбарчай працы вёсцы.

Тав. Грокаў ад імя рабочых-будаўнікоў заявіў, што яны ў справе наведваньня справаздачных сходаў рабочымі дасягнулі 96 проц. дасягнулі вялікай актыўнасьці ў абгаварваньні справаздач дэпутатаў гараднскога савету.

Але гэтага мала, мы павінны дасягнуць стопроцантнай яўкі на перавыбарчыя сходы—ставіць тав. Грокаў перад мітынгам задачу.

Рабочы лесазаводу № 2 заявіў аб тым, што рабочыя заводу вынесьлі пастанову аб масавым выезьдзе на вёску для дапамогі сялянству ў барацьбе з кулацтвам у час перавыбараў, гаварыў аб тым, што рабочыя парашылі актыўна ўдзельнічаць у перавыбарах на кварталах.

І прадстаўнік фанэрнага заводу, і рабочы лесапільнага заводу, і прадстаўнікі іншых прадпрыёмств, і Чырвонай арміі заявілі аб тым, што яны гатовы даць дапамогу вёсцы ў час перавыбараў—паслаць сваіх лепшых таварышоў.

Мітынг-перакліччка ў адказ на прывітаньне 5 акруговай партканферэнцыі паслаў ёй свой адказ, у якім заварае партыйную арганізацыю ў прыняцьці актыўнага ўдзелу ў перавыбарах саветаў, у арганізацыі і мабілізацыі ўвагі працоўных на надыходзячых перавыбарах, у аказаньні дапамогі вёсцы шляхам пасылкі на перавыбарчы час туды рабочых дружын.

Працоўныя Бабруйску таксама паслалі сваё прывітаньне Ураду БССР у асобе т. Чарвякова.

У сваёй рэзалюцыі мітынг-перакліччка пастанавіў паслаць прадаўнікоў на перавыбары ў вёску, абвясьціць дзень перавыбараў горсавету днём сьвята, паслаць делегацыі рабочых у Менск, Гомель, Барысаў, для азнаёмленьня з надрыхтоўкай да перавыбараў і сьвяткаваньня 10-годзьдзя БССР, абвясьціць конкурс на лепшую працу па падрыхтоўцы к перавыбарам саветаў, выклікаць Менск, Слуцак, Віцебск, Гомель, Рагачоў на перакліччку.

А. Дамброўскі.

Бабруйск.

Трэба даць рашучы адпор кляса-ваму ворагу.

(Ліст з Гомлю).

Кулак і розны антысавецкі элемент усталёўвае рыхтуецца да кампаніі перавыбараў саветаў. У некаторых сельсаветах Веткаўскага раёну кулакі пачалі рыхтавацца да перавыбарчай кампаніі яшчэ ў канцы пастрычніка месяца. У асобных сельсаветах раёну антысавецкі элемент выкарыстаў пастрычнікавыя сьвяты для нападжываньня сваіх сходаў. На гэтых сходах абмяркоўваліся кандыдатуры будучага складу сельсавету, задаваліся галасы сваіх прыхільнікаў і інш. У сяле Рудня-Стаўбунскай Веткаўскага раёну кулакі высунулі у старшыні сельсавету кандыдатуру ранейшага белагвардэйца.

У Церахоўскім раёне кулакі ўжываюць тэрор. У сяле Церахоўцы кулакі надпалілі гумно старшыні сельсавету у той момант, калі апошні рабіў справаздачу аб сваёй працы на сходзе сялян. Прычым кулакі і іх прыхільнікі са злоснаю ўсьмешкаю называлі да старшыні сельсавету і казалі: „Вось ты агітуеш за савецкую ўладу, а там гэрык твае гумно". Ужытымі захадамі ніва патушы затрыманы і знаходзіцца пад вартаю.

У сяле Васілеўскім Церахоўскага раёну кулакі два разы сарвалі справаздачныя сходы сельсавету. Для гэтай мэты яны ўжываюць розныя метады. Выходзяць на сярэдину дарогі і розными загрозамі прымушаюць сялян на хадзіць на справаздачныя сходы.

У селішчах Буда-Кашалёўскага раёну яшчэ да гэтага моманту жывуць раней вядомыя, якія інкнуцца праводзіць у сельсаветы сваіх стаўленікаў. У адным з селішчаў раёну сакратар сельсавету агітаваў сярод сялян, каб апошнія абіралі у склад сельсавету паважных людзей, г. зн. асоб, маючых буйную сельскую гаспадарку. У гэтай агітацыі прымаў удзел і «школьны правадчык» сяла, маючы свой пугар.

У селішчах Чачэрскага раёну кулакі агітуюць сярод сялян, каб апошнія не вазілі хлеб на рынак. Высоўваюць лёзунгі: «Прэч разьмежаваньне на клясы».

Для сваёй агітацыі кулакі вельмі часта выкарыстоўваюць нашы хаты-чытальні. У вячорнія гадзіны яны прыходзяць у чырвоныя куткі і ядуць гутаркі з нятрабнымі асобамі. У сяле Прысно Веткаўскага раёну заможная частка інкнуцца правесьці сваіх кандыдатаў. Для гэтае мэты яны загадна ядуць гутаркі аб необходнасьці абраньня ў старшыні сельсавету сваіх стаўленікаў. Кулакі, як глядзячы на адсутнасьць запросін, зьяўляюцца на сходы бедноты, чула прыслухоўваюцца даўсіх прапаноў для таго, каб быць у курсе ўсіх мерапрыёмстваў на правядзеньні прадвыбарчай кампаніі. Належыць адзначыць, што ў некаторых селішчах акругі кулакі розныя метады ўхітраюцца ўплываць на асобных сялян. Справа ў тым, што ў асобных раёнах кулакі ваюць пралезьці ў сельскія выбарчыя камісіі. Так, чачэрская раённая выбарчая камісія фармальна падышла да выбору складу сельскіх выбарчых камісій. Мацыянальна быў заньвержаны склад сельскіх выбарчых камісій. Не ўлічваўся сацыяльны склад камісій. У выніку аказалася, што ў шмат якіх сельскіх выбарчых камісіі пралезьлі асобы, якія пазбаўлены выбарчых правоў. У асобных селішчах Чачэрскага, Уваравіцкага раёнаў прыйшлося перарабляць склад выбарчых камісій.

У асобных раёнах былі адступленьні ад выбарчай інструкцыі. У адным сяле Веткаўскага раёну ў склад выбарчае камісіі ўвайшло 38 чалавек, а ў адным сяле Гомельскага раёну ў склад сельскае выбарчае камісіі быў уведзен прадстаўнік пімэрэтэраду. Зараз усе гэтыя памылкі выпраўлены.

Кулакі, не глядзячы на апісаныя вышэй пастановы аб забароне наведваць справаздачна-перавыбарчыя сходы, у курсе ўсіх пастановаў сходаў. Для гэтага яны пасылаюць сваіх дзяцей, каб тыя падслухоўвалі, і потым вядуць гутаркі з асобнымі сялянамі. Асабліва кулакі стараюцца, каб тыя старшыні сельсавету, якія з імі зьвязаны, зноў былі б абраны. Для гэтае мэты яны на справаздачных сходах, не глядзячы на бяздзейнасьць сельсавету, заяўляюць, што сельсавет добра працаваў, заўсёды бараніў інтарэсы сялян і яго належыць абрать у сельсавет. У тых селішчах, дзе старшыня вядзе барацьбу з кулакамі, апошнія супоча з іх прыслужнікамі інкнуцца скампрамітаваць старшыню сельсавету ў вачох вясельшчыка і агітуюць проці яго абраньня ў сельсавет.

Трэба сказаць, што ў той час, калі клясавы вораг вядзе ўзмоцненую падрыхтоўку да перавыбараў, масовыя арганізацыі не надаюць гэтаму асабліваго значэньня і працуюць вельмі слаба. Культурна-асьветныя установы яшчэ недастаткова разгарнулі сваю працу. Грамадзкія арганізацыі, між іншым прафсаюзныя, не зьвяртаюць належнае ўвагі перавыбарчай кампаніі. У шмат якіх вёсках праявае значная частка рабочых, але апошнія слаба ўдзельнічаюць у гэтай кампаніі.

Усе гэтыя факты яскрава гавораць аб необходнасьці ўзмацненьня барацьбы з антысавецкімі элементамі. Трэба даць рашучы адпор кулацкаму элементу, які ў даны момант выкарыстоўвае усе мэтады барацьбы проці савецкае ўлады і кампартыі, асабліва ў перавыбарчай кампаніі. Н-а.

Праца саветаў пад агнём самакрытыкі.

З сур'ёзнай крытыкай абгаварылі працу.

(Замошскі с-с Халопеніцкага раёну, Меншчына).

На Адамаўскім справаздачным пункце крытыка працы сельсавету была здаровая і дзелавая. Выступаўшыя ў спрэчках паказвалі на тое, што сельсавет стварэў валакіту, прымушаў сялян за якой-небудзь паперай хадзіць па 4—5 раз. Мала чаго сельсавет зрабіў у асеньня-пасеўную кампанію, не паклапаціўся аб сваечасовай дастаўцы насеньня.

Сельсавет амаль нічым не можа гаварыцца ў сэнсе палепшэньня сельскае гаспадаркі. Зямляўпарадкаваньне да сялянства яшчэ не дайшло; усюды па ўсім сельсавеце ўжываецца трохпалёўка, сельсаветам не было сумесна з агранамам праведзена растлумачэньне на гэтым пытаньні. Зусім слаба вялася праца сярод беднаты.

Не было ніякага кіраўніцтва і зацікаўленасьці з боку сельсавету існуючымі на тэрыторыі сельсавету усякімі арганізацыямі і ўстановамі, а таксама не было практычнай дапамогі ў іх працы.

Нагадаліся грубыя і бюракратычныя адносіны сельсавету да наведвальнікаў.

Слабавата ўцягнуты былі ў працу сябры сельсавету, а таксама зазначылі, што некаторыя члены сельсавету надбайна адносіліся да сваіх абавязкаў і г. д.

Выбаршчыкі зазначалі, што неабходна зьнішчыць бюракратызм, валакіту і п'янства; скарыстоўваць ініцыятыву мас; налавіць шчыльную сувязь з усімі арганізацыямі і ўстановамі; навесьці рашучую барацьбу з самагонакурэньнем; распачаць больш дзелавую працу з беднатаю і г. д.

Таксама сельсавету, сумесна з камітэтам узаемадапамогі, даручана выявіць усю беднату, каб у далейшым правідлова разьмяркоўваць ільготы па падатку, страхоўцы і г. д. Зазначалі на тое, каб сельсавет, у сувязі з неўраджаем, у гэтым годзе хадайнічаў перад адпаведнымі органамі аб забясьпечаньні беднаты хлебам.

У сувязі з тым, што ў справаздачнай кампаніі сельсавету прымаў удзел рабочы ў г. Менску, перад скананьнем справаздачнага сходу паслана прывітаньне ЦВК БССР за накіраваньне ў вёску рабочых ад варштату з мэтай азнаёмленьня з культурна-матар'яльным становішчам працоўнага сялянства, з працай нізавога савецкага апарату.

В. Гараўскі.

Сельсавет „высіджваў гадзіны"...

На Камяноцкім с/савеце ўжо скончана справаздачная кампанія. Падрыхтоўчая праца была праведзена на высім добра. У некаторых выбарчых вучастках апавяшчалася насельніцтва аб сходзе за гадзіну да яго пачатку.

У выніку гэтага на справаздачных сходах прысутнічала ня ніязначная колькасьць выбаршчыкаў (25—30 проц.) Справаздачу аб працы рабіў сакратар с/савету, які працуе ў сельсавеце ўсяго некалькі месяцаў.

Адгэтуль зразумела, што справаздача не магла поўнасьцю ўхапіць усю працу сельсавету за два гады. Сама справаздача пабудавана суха і фармальна. Усё гэта адбілася на актыўнасьці ў абгаварэньні працы с/савету.

Некаторы штуршок далі праведзеныя яч. КП(б)Б амаль па ўсіх вёсках сходы беднаты.

Па большасьці вучасткаў праца с/савету прызнана незадавальняючай. Наказ, даданы выбаршчыкамі пры мінулых перавыбарах, —навыкананы.

Арганізацыйны бок працы с/савету пастаўлен высім дрэнна. Сябры с/савету ў працу не ўцягнуты і заданьняў прэзыдыуму, у большасьці, не выканалі.

Прэзыдыумы і пленумы спраходзілі суха, зачастую са штучна-падабранымі парадкам дня. Сялянская актыву пры с/савеце няма; не працуюць і камісіі, за выключэньнем лясной і падатковай, якія займаліся розною «дзяльбою». Не працуюць таксама грамадзкія арганізацыі (МОПР, Асавіяхім, пажарная дружына). З боку с/с ні зацікаўленасьці ў іх працы, ні кіраўніцтва ня было.

Уся праца с/с зводзілася да «высіджваньня гадзін» у канцэлярыі с/с і дасылкі пратаколаў і адносін у РВК. Большасьць кампаній (асабліва сьвяткаваньняў галавін і г. д.) праводзілася габінэтным парадкам: складаецца камісія, якая напіша пратакол, апошні адсылаецца куды належыць з адпаведным нумарам і справе—канец.

Абраны пры мінулых перавыбарах прэзыдыум с/с пераданы пад суд за растрату лесу і зьнят з працы.

Цяпер працуе новы, «скалочаны на хуткую руку», мала прадаводзьны прэзыдыум. У яго працы мацца шмат недарочнасьцяў як у разьмеркаваньні сенажаці і інш., так і у канцэлярскім абслугоўваньні насельніцтва.

Рэвкамісія працаю прэзыдыуму мала цікавіцца, нават апошняя рэвізія зроблена пад канец справаздачнай кампаніі.

Выбаршчык.

Вузьдзенскі р-н, Менскае акр.

З посьпехамі і недахопамі.

(Чарнянскі с.-с., Шлюўскі р-н, Магілеўшчына).

Духавенства разам з кулацтвам імкнецца зрабіць перашкоду у справаздачна-выбарчай кампаніі. Папы агітуюць сялян, каб яны зрывалі сходы, альбо не наведвалі іх. У выніку чаго у в. Чорнае сход, вызначаны на 13 сьнежня, быў сарваны і адбыўся 14-га сьнежня, што перашкодзіла плянавасьці правядзеньня кампаніі.

На сходах выбаршчыкі крытыкуюць працу сельсавету, не забываючы памылак і посьпехаў у працы. Значныя дасягненьні ў працы сельсавету каюцца ў галіне калектывізацыі вёскі. У раёне сельсавету арганізавана з беднякоў адна сельска-гаспадарчая камуна імя Молатава. Праведзена зямляўпарадкаваньне ў в. Аўчынікі, зроблена абрэзка зямлі заможнікаў у в. Аляксандраўцы, за кошт якой надзелена зямлёю каля 10 беднякоў. Вясною будучага году будзе зямляўпарадкавана вёска Чорнае.

Школьная справа знаходзіцца ў добрым становішчы. Маецца 4 школы, з якіх 2 двухкомплектавыя і адна адна-комплектавая польская. Дзеці школьнага ўзросту ахоплены школамі на 100 проц.

На сродкі самаабкладаньня наладавана Трасьнянская школа, якая каштавала 800 рублёў і Аўчынінская школа, якая каштавала 500 руб. Сродкі ад самаабкладаньня скарыстоўваліся на патрэбы, прынятыя сходамі.

Сярод дасягненьняў—у працы былі і недахопы. Пры вучоце аб'ектаў абкладаньня некаторым грамадзянам была памылкова прыпісана лішняя жывёла. Былі выпадкі абкладаньня сераднякоў у індывідуальным парадку. Асабліва гэтыя недахопы мелі месца ў в. Аляксандраўцы. Але ў сучасны момант гэтыя памылкі выпраўлены.

Наказы выбаршчыкаў выкананы поўнасьцю.

Янка Булат.

Патрэбна больш актыўнасьці.

(Вёска Волма, Кліноцкага с-с. Чэрвеньскага р.)

Сялянства ў актыўнае абгаварэньне недахопаў і наогул працы сельсавету ўцягнута недастаткова. Гэты факт можна зацьвердзіць хаця-б сходам сялян в. Волма, Кліноцкага с-сав., дзе па справаздачы старшыні с-савету з боку сялян нельга было бачыць здаровай крытыкі па працы сельсавету.

Уся ўвага была згуртавана на працы школы і адзяленьні спажывецкага т-ва. Гэтыя ўважлівыя адносіны тлумачацца тым, што настаўнік школы гэтай вёскі з старшынёй праўленьня спажывецкага т-ва, як той казаў: „Мелі адзін на другога вока." А раз гэта так,—дык і давай на сходзе перад сялянствам адзін другога «шураваць» уздоўж і ўпоперак. Выявілася і такая справа, што настаўнік пабіў пажарную кабеціну, застаўлаў вучняў выганяць сьвіней з свайго агароду і інш.

Наогул кажучы, сялянства занесла таго, каб дапалёва абгаварыць працу с-савету—скаліла зубы з гэтых двух асоб. Толькі пад канец так-сяк раскачаліся і падкрэслілі, што сельсавет недастаткова зварачваў увагі на пабудову харог мясцовага значэньня, мала ўвагі зьвярталася пажарным дружынам, ад чаго і праца апошніх кульгала. Слабая работа членаў сельсавета і камісій, якія толькі лічыліся, а праводзіць работу прыходзілася старшыні с-сав. і сакратару. Паралку ў лесе мясцовага значэньня таксама ня было. На сходзе зусім мала было жанчын.

Пры перавыбарах с-с трэба будзе бедаце больш рашуча прыняць удзел у высоўваньні і абгаварэньні кандыдатур.

М. Процька.

Прафарганізацыі слаба рыхтуюцца да перавыбараў саветаў.

Гомель, 25-XII. Прафсаюзныя арганізацыі вёскі яшчэ не разгарнулі працы па ўдзелу ў кампаніі перавыбараў саветаў. Члены саюзаў, якія працуюць у Гомелі, а жывуць у вёсцы, таксама слаба ўдзельнічаюць у гэтай кампаніі.

У адным з савгасаў Уваравіцкага раёну група п'яных служачых сарвала справаздачны сход. Батракі мала ўцягнуты ў склад выбарчых камісій. У Рэчыцкім раёне старшыні Арцюваўскага і Сліпёнаўскага сельсаветаў не зьявіліся на скліканую канферэнцыю батракоў для справаздачы аб працы сельсавета. Холмецкі сельсавет зусім адмовіўся рабіць даклады аб сваёй працы перад батракамі. Гэтыя старшыні сельсаветаў лічаць зьнявагаю для сябе рабіць даклады перад батракамі і пастухамі.

У Нова-Барсукоўскім сельсавеце старшыня, на просьбу аб скліканьні сходу батракоў, адказаў:—Мы вашым батракам налета не даверым сьвіней пасьвіць, тым больш, лічу лішнім дапусьціць іх для абмеркаваньня нашай працы і яшчэ намечаньня кандыдатур.

У Касьпераўскім сельсавеце засьмялі ўпаўнаважанага райкому працаўнікоў зямлі і лесу, які прасіў сабрать сход батракоў. Наогул, выпадкі зьняважлівых адносін да батракоў не адзінкавыя.

Сьпіс можна было павялічыць. Але ён дастатковы для таго, каб мабілізаваць увагу партыйных і грамадзкіх арганізацый да гэтага пытаньня.

Спажывецкая каапэрацыя да перавыбараў саветаў.

Спажывецкая каапэрацыя сёлета прымае актыўны ўдзел у справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў. Белкаапсаюзам пасланы як рабочай, так і нізавой сеткі, дырэктыўныя лісты.

Гэтымі днямі выехамі 6 адказных працаўнікоў Белкаапсаюзу для праверкі выкананьня і ўдзелу ў гэтай працы. Райсаюзам таксама пасланы працаўнікі ў вёскі для ўдзелу ў гэтай кампаніі.

Белкаапсаюзам выпушчана спэцыяльная газэта, лістоўкі і лёзунгі. На мясцох таксама выпускаюцца спэцыяльныя праграмы аб працы мясцовага каапэратыва. Наш удзел зьяўляецца таксама ў распрацоўцы пляну правядзеньня кампаніі ў перавыбарчых камісіях. Уручаюцца абвесткі кожнаму пайшчыку аб абавязковым зьяўленьні на перавыбарчы сход.

Прапаўнікі каапэрацыі актыўна ўдзельнічаюць у арганізацыі сходаў беднаты, аргрнізоўваюцца сумесныя адзіныя выступленьні беднякоў і сераднякоў супроць абнагляўшага кулацтва. У шмат якіх мясцох будуць арганізаваны каапэрацыяй аднадзённыя дзіцячыя ясьлі ў дзень перавыбараў, каб даць магчымасьць кожнай жанчыне прысутнічаць на перавыбарчым сходзе.

Кампанія абслугоўваецца кіно-перасоўкамі Белкаапсаюзу. У каапэрацыйных гуртках і кутках праводзяцца спэцыяльныя гутаркі аб тым вялікім палітычным значэньні, якое мае перавыбарчая кампанія саветаў. Кнігагандлёвая сетка каапэрацыі дастаўляе ў вёску спэцыяльную літаратуру аб перавыбарах саветаў.

У агульны даклад аб працы савету ўключаецца таксама кароценькая навочная справаздача (20-25 хвіл.) аб працы мясцовага каапэратыву. Асноўныя моманты дакладу гэта: дасягненьні, недахопы, хлебныя труднасьці, пытаньні дастаўкі, канкрэтныя мерапрыёмствы па зьнішчэньні недахопаў і бліжэйшыя задачы. У агульны наказ аб працы новага савету ўключаецца таксама і наказ аб працы мясцовага каапэратыву.

Вось у асноўным тыя мерапрыёмствы, якія праводзяцца спажывецкай каапэрацыяй сёлета ў перавыбарчай кампаніі саветаў.

Я. Крылавіцкі.

Падрыхтоўка да перавыбараў праходзіць актыўна.

Беднякі даюць адпор варожым элемэнтам.

(Ліст з Аршанчыны).

Падрыхтоўчыя работы да перавыбараў саветаў зараз шырока разгарнуліся ў Аршанчыне.

Як становіцца бок у падрыхтоўчай працы трэба адзначыць выданьне па сваёй ініцыятыве акруговай выбарчай камісіі лёзунгаў да справаздачна-перавыбарчай кампаніі палітычнага і практычнага зьместу. Гэтыя лёзунгі разасланы па ўсіх раённых, гарадзкіх і сельскіх выбарчых камісіях. Таксама разьмеркаваны плякаты, выданыя ЦВК БССР аб удзеле жанчын у перавыбарах саветаў.

Вялікая праца выканана ў галіне прапаганды і растлумачэньня задач надыходзячых перавыбараў: па 6-ці раёнах праведзены 272 сходы і пленумы, 22 парады (на 5-ці раёнах), у адным раёне праведзены 9 канферэнцый жанчын.

Сетка выбарчых вучасткаў сёлета значна пашырана. Вялікі вестак з 10-ці раёнаў, арганізаваны 1433 выбарчыя вучасткі, з іх 41 нацыянальных (у мінулую кампанію 15 канвучасткаў): 23 яўрэйскія, 13 польскіх, 4 літоўскія і 1 латыскі. Сёлета выбарчыя вучасткі ахопліваюць меншую тэрыторыю ў параўнаньні з мінулымі выбарамі саветаў. Павялічэньне вучасткаў дасягае ў некаторых раёнах да 50 проц. У сярэдніх кожны выбарчы вучастак ахоплівае 200, 300, а часам і да 400 жыхароў.

Што-ж датычыцца справаздачнай кампаніі, дык на 15-га сьнежня па паасобных раёнах можна заўважыць плянавае правядзеньне яе. Пры выпраўоўцы заказаў бываюць часта факты ня досыць поўнага абгаварэньня іх на сходах і групах беднаты і пашыраных нарадах вясковага актыву. Цяжка сказаць, ці праводзіцца гэта ўсюды, але той матар'ял, які мы маем з 7-мі раёнаў, сьведчаць аб тым, што ў большасьці адмяжоўваюцца пералікамі агульных задач партыі і ўлады, ужываецца шмат звонкіх і незразумелых сялянству слоў. Мала гэтага, дык часта наказы займаюць 3-4 друкаваныя аркушы, што, бязумоўна, адбіваецца адмоўна на ўвазе да пытаньняў в боку сходу.

Цікава сьмяшна на ліку ўдзельнікаў на перавыбарчых сходах. Процант выбаршчыкаў хістаецца ад 40 да 75-ці. Трэба заўважыць, як агульнае правіла, што сёлета значна павялічылася актыўнасьць бядняцкіх мас. З другога боку, павялічылася зацікаўленасьць серадняцкіх пластоў вёскі да сходаў беднаты. Сераднякі часта нават абражаюцца, калі іх не заклікаюць на сходы беднаты.

Адмоўным момантам у перадвыбарчай кампаніі зьяўляецца слабы ўдзел у сходах батрацтва. Па 192 сходах усяго зьявілася 11,2 проц. батрацтва ў адносінах да агульнага ліку. Саветы яшчэ ня прынялі належных мер у справе ўцягненьня батрацтва ў перавыбарчую кампанію.

Трэба таксама сьмяшна на павялічэньні актыўнасьці жаночай часткі насельніцтва. Праўда, па 192 сходах удзел жанчын усяго дасягае 27 проц., але значна павялічыўся процант жанчын у спрэчках, даходзячы ў спрэдніх да 19-ці. Жанчыны жвава абмяркоўваюць пытаньні аб самаабкладаньні, аб арганізацыі вяндовак і інш.

Увогуле заўважаецца павялічэньне актыўнасьці сялянства. Па 192 сходах выступала ў спрэчках 9,7 проц.

Ва што галоўным чынам скардзяцца сяляне?—на слабую працу каапэрацыі, на павольны рост школьнай сеткі, марудны тэмп землеўпарадкаваньня, на дрэнныя дарогі.

Як і ў ін. акругах, кулак і ў нас ня можа спакойна глядзець на падрыхтоўку да перавыбараў саветаў. Кулацкія элементы часта арганізуюць „свае" патаемныя сходы, каб вызначыць сваіх кандыдатаў. Такі выпадак здарыўся ў в. Замошцы, Аляксандраўскага с.с. Копыскага р. Каб ведаць, аб чым гаворыцца на сходах бедакаты, яны пасылаюць туды сваіх дзяцей. Вельмі часта кулацтва нападжвае п'яных, каб спаіць беднату, каб схіліць яе на свой бок, але бяднацкія і серадняцкія пласты вёскі даюць адпор варожым сілам дыктатуры пралетарыяту.

Н—і.

З ДАСЯГНЕНЬНЯМІ І НЕ БЕЗ НЕДАХОПАУ

(Самахвалавіцкі с.-с., Меншчына).

Па нашаму сельсавету зямляўпарадкавана, згодна пляну, дзьве вёскі і пасёлак на 960 гэкт., а дзьве вёскі падрыхтаваны да зямляўпарадкаваньня. Распаўсюджана 2-й сялянскай пазыкі на 1572 р. 50 к. і 2-й пазыкі індустрыялізацыі на 2215 р. ці на 110 проц. заданьня.

Самаабкладаньне праведзена па ўсяму с.-с. з актыўнай дапамогай партыйных і грамадзкіх арганізацый на 35 проц. ії на сабраныя грошы па самаабкладаньню для палепшаньня дабрабыту вёсак пабудавана 16 новых мастоў, 4 адрамантавана, выкапана і пабудавана 4 бэтонныя студні; перакрыт пад чарапіцу будынак інтэрнату для бядняцкіх вучняў; куплена пажарная машына; папраўлена 11 грэблёў на працягу 1560 метраў; пракапана канаў бакавых на працягу 1544 м., адводных канаў дзеля спуска вады на працягу 79 м. і дадзена на пабудову ў м-ку ветлячэбніцы 1000 р., якая к 10-годзьдзю агалашэньня БССР будзе адчынена.

Плянавасьць у працы пленума і скліку гэтакіх выканая поўнасьцю.

Дзеля наданьня сваёй рабоце масавасьці с.-с. склікаліся нарады актыву, дзе даваліся ўсялякія тлумачэньні і дырэктывы, а таксама абгаварваліся і падрыхтоўваліся пытаньні для агульнага сходу. Сувязь з масамі ўтваралася шляхам выездаў на месца і пастаноўкі справаздач на агульных сходах.

Выпадкаў парушэньня клясавай лініі не нагадалася. Заведзен вучот масавай працы і актыву, які складаецца з лепшай часткі беднякоў, сераднякоў і настаўніцтва.

Але поплеч з станоўчымі бакамі маюцца і адмоўныя бакі. Наказы выбаршчыкаў і дырэктывы кіруючых вышэйшых устаноў выкананы ўсяго на 70 проц. Па калектывізацыі с.-г. праведзены былі часткаю толькі гутаркі; частка беднаты згодна на арганізацыю калгаспадарак, але рэальнага нічога ня зроблена.

Па хлебасырцовых загатоўках заданьне РВК праведзена толькі на 50 проц. Па ўцягненьню насельніцтва ў касу ашчаднасьці праведзена было толькі 2 сходы, якія рэальных вынікаў не далі.

Г.

БЕДНАТА ПЕРАМОЖА.

Арганізацыйна-падрыхтоўчая праца да перавыбарчай кампаніі сельсаветаў у Парыцкім раёне амаль ужо скончана.

Сьпісы выбаршчыкаў, а таксама асоб пазбаўленых у выбарчых правох, ужо складзены. Колькасьць пазбаўленых у выбарчых правох па параўнаньні з мінулым годам сёлета павялічылася да 200 чалавек. Так, у мінулую кампанію сельсаветаў іх было 950 чалавек па раёну, а ў сёлетнюю павялічылася да 1200, што складае да агульнага ліку выбаршчыкаў—5 проц.

Лік выбарчых вучасткаў у сёлетнім годзе павялічыўся, па параўнаньні з мінулым годам, на 30, так як раней было 117, а сёлета 147. На кожны выбарчы вучастак прыходзіцца ў сярэнім на 150 выбаршчыкаў, альбо 326 чалавек наогул усяго жыхарства. Гэта павялічэньне дасьць магчымасьць павялічыць колькасны ўдзел выбаршчыкаў у перавыбарах, так як ёсьць вёскі, дзе раней выбарчага вучастку ня было і выбаршчыкам прыходзілася ісьці за 2-3 вярсты да таго вучастку, да якога прымацавана была іх вёска і, бязумоўна, гэта перашкодна адбівалася на актыўнасьці і колькасным удзеле выбаршчыкаў.

Справаздачы сельскіх саветаў ужо даўно складзены, для дапамогі у складаньні якіх упаўнаважаныя РВК выяжджалі ў сельсаветы 15 XI і прабылі на райёне 5 дзён. Трэба адзначыць, што некаторыя сельсаветы папярэдня склалі справаздачы па-казённаму, як напрыклад: Пратасаўскі сельсавет указаў, што ў райёне сельсавету мецца 10 швейных машын, з якіх 6 абслугоўваюць толькі сям'ю, і на-другое, што ў сельсавеце будуецца новая школа, але яшчэ пабудовай на скончана, таму што сяляне ня прымаюць мер да вывазкі лесу. Між тым не указаў, як сельсаветам былі праведзены гаспадарчыя кампаніі, як разьмяркованы ільготы па падатку, страхоўцы, па лесаматар'ялах, якая сувязь была сельсавету з сялянствам. Вядома, што такая справаздача сельсавету не зацікавіла выбаршчыкаў.

Прадсправаздачныя сходы беднаты амаль па ўсіх сельсаветах ужо праведзены. Усяго да гэтага часу праведзена 40 сходаў, акрамя гэтага будзе праведзена яшчэ ня менш як 10. Такім чынам, усе выбарчыя вучасткі, дзе мецца значная частка беднаты, ахоплены сходамі бядняцкімі. Прычым пры правядзеньні ранейшых кампаній саветаў, самая большая колькасьць сходаў беднаты праводзілася да 20, а сёлета ў сярэдніх па 3 сходы на сельсавет. На некаторых сходах заслухоўваліся справаздачы сельсаветаў і адначасова абмаркоўваліся пытаньні аб задачах беднаты ў перавыбарчай кампаніі саветаў. Трэба адзначыць, што актыўнасьць беднаты ўзрастае, яна актыўна прымае ўдзел у абмеркаваньні пытаньняў савецка-гаспадарчага будаўніцтва. Галоўная ўвага беднаты на сходах зьварталася на наступныя пытаньні:

Недастаткова адпускаюць лесу, мала таварау у каапэрацыі патрэбных для селяніна, а ў прыватнікаў яны ёсьць, мала праводзяць зямляўпарадкаваньня, недастаткова школ. Сельсаветы недастаткова абгаварваюць на сходах беднаты аб ільготах і інш. пытаньнях; мала заведваюцца агранамы; як поўнасьцю сельсаветы скарыстаді сродкі ад самаабкладаньня і не дакладзі справаздач аб іх скарыстаньні, і адначасова адбіраюць метады самаабкладаньня, што дае магчымасьць палепшыць дабрабыт вёскі. У Гарохавіцкім сельсавеце сход беднаты працу сельсавету прызнаў незадавальняючай таму, што сельсавет ня быў зьвязан з беднатой і мала абгаварваў пытаньняў на сходах беднаты аб розных ільготах і г. д. Наогул трэба сказаць, што беднота стаіць настаўна сав. улады і яна адабрае правядзеньне гэткіх сходаў і на перавыбарчых і справаздачных сходах будзе выступаць у саюзе з сярэдняком супроць кулака.

30-га лістапада адбыўся пленум РВК з удзелам старшынь і сакратароў сельсаветаў, членаў райённай выб. камісіі і прадстаўнікоў устаноў і арганізацый, дзе побач з іншымі пытаньнямі стаяла пытаньне аб перавыбарчай кампаніі саветаў.

У сёлетнюю кампанію на перавыбарах саветаў было намечана правесьці ў кожны сельсавет па 2-3 сходы жанчын, але трэба сказаць, што яны пакуль-што яшчэ ня ўсюды праведзены, а на тых зьвестках, дзе ўжо праведзены, трэба сказаць, што жанчыны ахвотна ідуць на сходы і пачынаюць праяўляць актыўнасьць, як, напрыклад: у Чэрвінскім сельсав. сходы прайшлі актыўна, жанчыны актыўна крытыкавалі працу сельскага савету. Тутжа і выявілася клясавая барацьба. Нават выступалі некаторыя моцныя серадняцкі з упрокамі па адрасу беднаты, што ўсё дае толькі для беднаты, а яны бедныя, а паглядзіце як яны купляюць у каапэрацыі крамны тавар больш, чым мы. Такім выступленьням быў дадзен належны адказ.

УДЗЕЛ МАСАВЫХ АРГАНІЗАЦЫЙ.

Трэба адзначыць, што ўдзел масавых арганізацый да перавыбарчай кампаніі саветаў, як-та: КСУ, каапэрацыі і іншых, кволы. Што датычыцца прафсаюзаў, дык трэба сказаць, што падрыхтоўчую працу да перавыбараў саветаў яны правялі здавальняюча, напрыклад: у м. Парычах была праведзена канферэнцыя батрацтва і пастушства, на якой была завострана ўвага на пытаньне аб удзеле батрацтва ў перавыбарчай кампаніі саветаў; акрамя гэтага, на мясцох на рабочкомах, мясцкомах гэта пытаньне таксама абгаварвалася, акрамя гэтага стаяла на настаўніцкай райённай канферэнцыі, якая адбылася 25-XI-г. г. і на актыве ўсіх прафсаюзаў. Такім чынам, пытаньне аб перавыбарчай кампаніі саветаў сярод прафсаюзных арганізацый дастаткова было завострана.

У сёлетнюю перавыбарчую кампанію саветаў РВК мяркуе высунуць на самастойную адказную працу ў сельсаветы на пасаду старшынь сельсав.—2 жанчыны і на пасаду сакратара сельсав.—1.

Актыўнасьць варожых нам сіл, як і трэба было чакаць, ужо нараз пачынае праяўляцца. Заможна-кулацкія элементы пачынаюць рыхтавацца да перавыбарчай кампаніі саветаў, рыхтуюць сваіх кандыдатаў у склад саветаў і гэты элемент асабліва сёлета пачынае праяўляць сваю палітычную актыўнасьць і ўсякімі мерамі і метадамі праяўляе нянавісьць к мерапрыёмствам, якія праводзяцца сав. уладай, нават прыбягае к формам тэрору. Напрыклад, ня так даўно з-за месьці быў забіт вясковы актывіст лясьнік, была спалена маёмасьць 2-х старшынь сельсаветаў і школа.

Падрыхтоўка да перавыбарчай кампаніі кулацкіх элементаў заключаецца ў наступным: у Каралёва

Законы і загады ўраду БССР.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

пра дапаўненьне статуту беларускага саюзу кааперацыйных спажывецкіх аб'яднаньняў (Белкаапсаюз).

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Дапоўніць статут Белкаапсаюзу (З. З. БССР, 2 адд., 1925 г., № 6, арт. 7) параграфам 3-а наступнага зьместу:

«3-а. У складзе Белкаапсаюзу можа быць арганізавана секцыя рабочай кааперацыі, якая карыстаецца правамі юрыдычнае асобы і дзейнічае паводле статуту (палажэньня), зацьверджанага сходам упаўнаважаных (саветам) Белкаапсаюзу з наступнай рэгістрацыяй яго ва ўстаноўленым парадку».

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

24 сьнежня 1928 г.,
г. Менск.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

пра льготы па мясцоваму падатку з транспартных сродкаў для членаў таварыства «Аўтадор» БССР.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

Для больш пасьпяховага пашырэньня ідэй Аўтадору і механізаванага транспарту паменшыць на 25 проц. гранічны памер мясцовага падатку з транспартных сродкаў за веласіпэды і матацыклы, якія належаць членам Беларускага Таварыства Дапамогі разьвіцьцю аўтамабілізму і палепшаньню шляхоў (Аўтадор).

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

24 сьнежня 1928 г.
г. Менск.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

пра нормы брані падлеткаў.

Для разьвіцьця пастановы ЦВК і СНК БССР за 1-е жніўня 1928 г. „Пра гранічныя нормы брані падлеткаў у прамысловасьці і іншых галінах народнае гаспадаркі" (З. З. СССР 1928 г., № 49, арт. 437) Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Устанавіць наступныя нормы брані падлеткаў у пасобных галінах народнае гаспадаркі і ва ўстановах:

а) у савецкіх гаспадарках—15 проц.;

б) у тэатрах, цырках, кіно, фото, у прадпрыёмствах народнага харчаваньня, адчыненых для агульнага карыстаньня—10 проц.;

в) у хлебапякарнях, броварнай і дражджавой прамысловасьці і гаслёвых установах і прадпрыёмствах—6 проц.;

г) у цэмэнта-агнятрывалай прамысловасьці і ў прадпрыёмствах народнага харчаваньня, не адчыненых для агульнага харчаваньня—5 проц.;

д) у вапна-алябастравай прамысловасьці—4 проц.;

е) у адміністрацыйных і адміністрацыйна-гаспадарчых установах, апрача тых, якія знаходзяцца на дзяржаўным альбо мясцовым бюджэце—3 проц.

2. З выданьнем гэтае пастановы касуюцца:

а) пастанова СНК БССР за 22 ліпеня 1924 г. „Пра ўстанаўленьне гранічнага мінімуму колькасьці падлеткаў у прадпрыёмствах" (З. З. БССР 1924 г., № 14, арт. 123);

б) пастанова СНК БССР за 11 лютага 1925 г. „Аб дапаўненьні пастановы СНК БССР за 22 ліпеня 1924 г. (З. У. 1924 г. № 14, арт. 123). «Пра ўстанаўленьне гранічнага мінімуму колькасьці падлеткаў у прадпрыёмствах» (З. З. БССР 1925 г., № 9, арт. 87);

в) пастанова СНК БССР за 4 чэрвеня 1927 г. «Пра ўстанаўленьне норм брані падлеткаў на будаўнічых работах» (З. З. БССР 1927 г., № 28, арт. 137).

3. Пастанова СНК БССР за 25 лютага 1925 г. „Пра ўстанаўленьне колькасьці падлеткаў у адносінах да дарослых рабочых у дробных прадпрыёмствах" (З. З. БССР 1925 г., № 16, арт. 119) застаецца ў сіле.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

24 сьнежня 1928 году,
г. Менск.

Постановление
Совета Народных Комиссаров БССР

о дополнении устава белорусского союза кооперативных потребительских об'единений (Белкоопсоюза).

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

Дополнить устав Белкоопсоюза (С. У. БССР, 2 отд. 1925 г., № 6, ст. 7) параграфом 3-а следующего содержания:

«3-а. В составе Белкоопсоюза может быть организована секция рабочей кооперации, пользующаяся правами юридического лица и действующая согласно устава (положения), утвержденного собранием уполномоченных (советом) Белкоопсоюза с последующей регистрацией его в установленном порядке».

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Л. Дубовицкий.

24 декабря 1928 г.
г. Минск.

Постановление
Совета Народных Комиссаров БССР

о льготах по местному налогу с транспортных средств для членов общества «Автодор» БССР.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

Для более успешного распространения идей Автодора и механизированного транспорта уменьшить на 25 проц. предельный размер местного налога с транспортных средств за велосипеды и мотоциклы, принадлежащие членам Белорусского Общества помощи развитию автомобильного дела и улучшения дорог (Автодор).

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Л. Дубовицкий.

24 декабря 1928 году,
г. Минск.

Постановление
Совета Народных Комиссаров БССР

о нормах брони-подростков.

В развитие постановления Центрального Исполнительного Комитета и Совета Народных Комиссаров СССР от 1-го августа 1928 г. «О предельных нормах брони-подростков в промышленности и других отраслях народного хозяйства» (С. З. СССР 1928 г., № 49, ст. 437) Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Установить следующие нормы брони-подростков в отдельных отраслях народного хозяйства в учреждениях:

а) в советских хозяйствах—15 проц.;

б) в театрах, цирках, кино, фото и предприятиях народного питания, открытых для общего пользования 10 проц.;

в) в хлебопекарнях, пищевой и дрожжевой промышленностях в торговых учреждениях и предприятиях 6 проц.;

г) в цементно-огнеупорной промышленности и в предприятиях народного питания, не открытых для общего питания 5 проц.;

д) в известково-алебастровой промышленности 4 пр.:

е) в административных в административно-хозяйственных учреждениях кроме тех, кои находятся на государственном или местном бюджетах 3 пр.

2. С изданием настоящего постановления отменяются:

а) Постановление СНК БССР от 22 июля 1924 г. «Об установлении предельного минимума количества подростков в предприятиях (С. У. БССР 1924 г. № 14, ст. 123);

б) Постановление СНК БССР от 11 февраля 1925 г. „О дополнении постановления СНК БССР от 22 июля 1924 г. (С. У. 1924 г. № 14 ст. 123) «Об установлении предельного минимума количества подростков в предприятиях (С. З. БССР 1925 г. № 9, ст. 87);

в) Постановление СНК БССР от 4 июня 1927 г. «Об установлении норм брони-подростков на строительных работах» (С. З. БССР 1927 г., № 28, ст. 137).

3. Постановление СНК БССР от 25 февраля 1925 г. „Об установлении количества подростков в отношении к взрослым рабочим в мелких предприятиях (С. У. БССР 1925 г., № 16, ст. 119) остается в силе.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Л. Дубовицкий.

24 декабря 1928 г.
г. Минск.

Постановление
Совета Народных Комиссаров БССР

о порядке занятия и оплаты служебными лицами квартир при государственных учреждениях.

Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. С 1-го октября 1928 года все сотрудники, занимающие квартиры при государственных учреждениях, должны, отмечивать их на основании законов о квартирной плате.

2. Суммы от указанной в ст. 1 квартирной платы засчитываются в специальные средства учреждения.

3. Сотрудники, проживающие в квартирах при государственных учреждениях и получающие от учреждения отопление, освещение и воду, должны возместить учреждению ту сумму, какую учреждение расходует на удовлетворение указанных нужд сотрудников.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Л. Дубовицкий.

24 декабря 1928 г.
г. Минск.

Пастанова
Савету Народных Камісараў БССР

аб арганізацыі пры прадпрыёмствах Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі курсаў для вучняў-падлеткаў, якія навучаюцца ў парадку брыгадна-індывідуальнага вучнёўства.

Для падняцьця кваліфікацыі вучняў-падлеткаў, якія навучаюцца ў прамысловасьці ў парадку брыгаднага альбо індывідуальнага вучнёўства, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Вышэйшы Савет Народнае Гаспадаркі БССР арганізоўваць пры прадпрыёмствах, дзе ідзе вучняў, якія навучаюцца ў парадку брыгаднага альбо індывідуальнага вучнёўства, складае 20 чалавек і больш, курсы для набыцьця гэтымі вучнямі належных тэхнічных і агульнаадукацыйных ведаў.

2. Утрыманьне курсаў усклясьці на трэсты і асобныя гаспадарчыя прадпрыёмствы, якія знаходзяцца пад загадам Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР Л. Дубавіцкі.

24 сьнежня 1928 году.
г. Менск.

Постановление
Совета Народных Комиссаров БССР

об организации при предприятиях высшего совета нар дного хозяйства курсов для учеников-подростков, обучающихся в порядке бригадно-индивидуального ученичества.

Для повышения квалификации учеников-подростков, обучающихся в промышленности в порядке бри гадного или индивидуального ученичества Совет Народных Комиссаров БССР постановляет:

1. Обязать Высший Совет Народного Хозяйства БССР организовывать при предприятиях, в которых число учеников, обучающихся в порядке бригадного или индивидуального ученичества, составляет 20 человек и больше, курсы для приобретения указанными учениками должных технических и общеобразовательных знаний.

2. Содержание курсов возложить на трэсты и отдельные хозяйственные предприятия, находящиеся в ведении Высшего Совета Народного Хозяйства.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР Н. Голодед.

Зам. Управляющего Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР Л. Дубовицкий.

24 декабря 1928 года.
г. Минск.

ХРОНІКА.

Да 10-годзьдзя БССР.

Пашырэньне ясьляў.

Да часу сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР ясьлі № 5 пашыраюцца да 35 ложкаў для абслугоўваньня дзяцей адзіночак.

На пашырэньне гэтых ясьляў Цэнтральная Дзіцячая Камісія пры ЦВК БССР адпускае неабходныя сродкі.

Пушкінская бібліятэка—да часу сьвята.

У Пушкінскай бібліятэцы зараз арганізуецца выстаўка беларускай літаратуры, якая будзе характарызаваць нашы дасягненьні па культурна-гаспадарчаму будаўніцтву за 10 год.

Апрача гэтага, 29-га сьнежня наладжваецца вечар чытачоў бібліятэкі, прысьвечаны юбілею. На вечары будзе пастаўлек даклад аб дасягненьнях у галіне асьветы БССР за 10 год.

Удзел фізкультурнікаў у сьвяткаваньні.

Фізкультурныя гуткі зараз узмоцнена рыхтуюцца да сьвята 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР.

У час сьвята фізкультурнікі прымуць удзел у вечарох і масавых пастаноўках, якія адбудуцца ў клюбах.

Выстаўка беларускай кнігі.

Да часу сьвяткаваньня 10-годзьдзя агалашэньня БССР, Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва арганізуе ў новым Цэнтральным Доме Сел-ніна выстаўку беларускай кнігі.

Выстаўка будзе характарызаваць дасягненьні беларускага друку за 10 год, а таксама працесы друкарскай работы.

Прыгародныя хаты-чытальні да юбілею.

Прыгародныя хаты-чытальні рыхтуюцца да юбілею 10-годзьдзя БССР. Праводзяцца з сялянствам гутарки, даклады на тэму аб нашых дасягненьнях да 10-годзьдзя БССР, а таксама чытка мастацкай беларускай літаратуры.

Апрача гэтага адбудуцца вечары з удзелам сялянства, прысьвечаныя 10-гадоваму юбілею БССР.

10 юбілейны нумар часопісі „Наш Край".

Цэнтральнае Бюро Краязнаўства БССР выпускае да часу сьвята 10-цігодзьдзя агалашэньня БССР юбілейны нумар часопісі «Наш Край».

Нумар часопісі будзе прысьвечаны дасягненьням краязнаўства да 10-й гадавіны БССР.

Абслугоўваньне беспрацоўных у дні сьвята.

Для беспрацоўных у дні сьвяткаваньня 10-годзьдзя агалашэньня БССР будзе наладжаны шэраг вечароў з спэктаклямі і з дакладамі аб дасягненьнях за 10 год. Да дзён сьвята беспрацоўным будзе выдадзена 250 білетаў у баню і 500 дарэмных абедаў.

Устаноўка гучна-гаварыцеляў.

У дні сьвята ў Менску будзе ўстаноўлены шэраг гучна-гаварыцеляў. Так, на Плошчы Волі будзе ўстаноўлена 2 рэпрадуктары, па аднаму—на абодных вакзалах МЗБ чыгункі, на рагу Савецкай і Энгельса і і рэпрадуктар будзе ўстаноўлены на Плошчы Парыжскай Камуны. Разам з тым гучна-гаварыцелі будуць устаноўлены ў тых раёнах Менішчыны, дзе няма сувязі.

Закладка новых дамоў.

У дні сьвята будзе наладжана ўрачыстае адчыненьне менскага халадзільніка і працалентыву па вырабу цацак. Завод „Дрэвапрацовачнік" урачыста адсьвяткуе пераход у новыя будынкі. Шасьце на ўдзе правесьці ў дні сьвят закладку дома для Дзяржбанку і дому на 50—60 кватэр для рабочых.

Утварэньне тэхнічнага інстытуту.

На вагонім сходзе навуковых працаўнікоў СССР быў заслуханы даклад прадстаўніка ВСНГ СССР аб утварэньні новых тэхнічных інстытутаў ВСНГ. Выявілася, што ВСНГ СССР мае на ўвазе заснаваць у БССР навукова-тэхнічны інстытут, больш глыбокай пастаноўкі вывучэньня розных галін прамысловасьці БССР.

Попыт на беларускую мэблёвую вытворчасьць.

Маскоўскай канторай Белпайгандлю падпісан дагавор з Уральскім абласным саюзам на пастаўку апошняму ў бягучым гаспадарчым годзе 30 вагонаў вешскіх крэслаў, вытворчасьці Віцебскай мэблёвай фабрыкі.

У вялікім попыту таксама сталовая і канцылярская мэбля, прадукты беларускіх мэблёвых фабрык, на якіх попыт не здавальняецца.

Пабудова аўта-рамонтных майстэрняў.

Прэзідыум ВСНГ учора у Дзяржплане прыняў пабудову ў БССР 3-х аўта-рамонтных майстэрняў. Майстэрні стануць сабе задачу рамонтаваць трактары, аўтабусы і аўтамабілі і буйныя с.-г. машыны.

Выдача новых лекавых кніжак.

Управа Сацыяльнага Страхаваньня ўводзіць з 1-га студзеня 1929 г. новыя лекавыя кніжкі для застрахаваных. Гэтыя кніжкі будуць значна меншыя цяперашніх і дзякуючы новай сыстэме запісаў, значна палягчаюць спосаб атрыманьня дапамогі на часовай непрацаздольнасьці.

Рэалізацыя беларускіх тавараў.

З пачатку бягучага аперацыйнага году Маскоўскай канторай Белпайгандлю прададзена 35 вагонаў шпалераў.

У сувязі з загружанасьцю беларускіх шпалерных фабрык заказамі да 1-га мая 1929, Маскоўская кантора Белпайгандлю ўжо больш не прымае заказаў на пастаўку шпалераў да паказанага тэрміну.

Чырвоны Крым у вёсцы.

Менскі акруговы камітэт Чырвонага Крыжу арганізуе ў бягучым гаспадарчым годзе ў кожным раёне округі на адной паказальнай стуцы.

Апрача гэтага будуць арганізаваны лазні ў Пухавіцкім, Сьмілавіцкім і Узьдзенскім раёнах, 2 ліпучных ясьляў у Бярэзінскім і Лагойскім раёнах і зубных кабінэтаў у Халопеніцкім, Грэскім, Плошчаніцкім і Бягомльскім раёнах.

Кіно—працоўным.

31 сьнежня ва ўсіх кіно Менску будуць наладжаны бясплатныя сэансы для членаў прафсаюзаў, дзяцей і вайскоўцаў. Кіно «Культура» пачала «Кастуся Каліноўскага», „Чырвоная Зорка"—«Его Превосходительство», «Пятар аціяна»—«Лесную быль» і піянэрнае - «Грымка Сьвіпалас». Праз усе кіно будзе прапушчана больш 6500 чалавек.

Урачыстае адчыненьне сямёхгодкі на Ляхаўцы.

30 сьнежня а 6-й гадзіне ўвечары адбудзецца ўрачыстае адчыненьне ляхаўскай сямёхгодкі. На адчыненьне запрошаны рабочыя заводаў, а таксама т. т. Гамарнік, Стасевіч, Чарвяноў, Хацкевіч, Галадзед, Баліцкі і Славінскі.

Удзел Чырвонага крыжу ў аглядзе чырв. казармы

1-га студзеня пачынаецца ўдзел усіх часьцяў Чырвонай армії агляд чырвонай казармы. У сувязі з гэтым ЦК Беларускага т-ва Чырвонага Крыжу запрапанаваў усім акруговым камітэтам прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні агляду. Запрапанавана выдзеліць прадстаўнікоў Чырвонага Крыжу ў камісіях па правядзеньню агляду, а таксама аказаць матар'яльную дапамогу на стварэньню культурных умоў і санітарна-асьветнай працы ў казармах. У час агляду будзе весьціся праца па арганізацыі куткоў Чырвонага Крыжу, забясьпечаньня санітарна-асьветнай літаратурай і г. д.

Мэталётавары для БССР.

Для забясьпечаньня БССР мэталётаварамі на 2-гі квартал бягучага гаспадарчага году выдзелена 621 тона дахавага жалеза, 828тон сартавога і 94 тоны ацынкаванага.

З гэтай колькасьці спажывецкая кааперацыя БССР атрымае 174 тоны дахавага жалеза, 143 тоны сартавога і 24 тоны ацынкаванага.

Заканчваецца рамонт санаторыя «Чырвоны Кастрычнік»

У сучасны момант у сухотным санаторыі „Чырвоны Кастрычнік" (Астраўшыні-Гарадок) заканчваецца капітальны рамонт.

Адчыненьне санаторыя намячаецца зрабіць 10-15 студзеня.

Санаторы разьлічаны на 80-85 сухотных хворых.

Тэатр-кіно.

Блізкейшыя пастаноўкі БДТІ.

У гутарцы з нашым супрацоўнікам дырэктар БДТІ т. Сэлих паведаміў аб бліжэйшых тэатральных пастаноўках.

— У другім паўгодзьдзе,—адзначыў т. Сэлих, будзе пастаўлена шэраг новых і старых п'ес. У далёкае лютага [illegible] 1929 г. будзе пастаўлена п'еса Рамановіча «Мосты», якая малюе дзейнасьць аддзелу сакрэтнай улазнае спэцыяліста. 4-га студзеня пойдзе «Крывая абліцо», якая летась ужо ставілася ў Віцебску, але Менск гэтай п'есы яшчэ ня бачыў. Маюць быць пастаўлены п'есы: Дзяржэнка „Шлях"; Шашалевіча і Лахматага. Апроч гэтага, будуць адноўлены п'есы: «Кар'ера т. Брызгаліна» і „Перамога". «Кар'ера т. Брызгаліна» будзе пастаўлена на рухомай сцэне, у новай канструкцыі, з новымі макетамі.

У канцы тэатральнага сэзону будзе пастаўлена адна клясічная п'еса. На пастаноўку гэтае п'есы будзе запрошаны рэжысэр тэатру Вахтангава, Аляксей Попаў.

Опэрныя пастаноўкі.

У кутнім часе Белмузтэхнікум рыхтуе оперу «Тарас на Парнасе». Таксама рыхтуецца опера «Русалка», якую ставіць Белмузтэхнікум сумесна з Беларускай Дзяржэйнай капэлай.

Кіно-сцэнары з эпохі 1905 г.

Рэжысэр БДТІ Міровіч зараз піша кіно-сцэнары з рэвалюцыйнай эпохі 1905-х. у Беларусі. Кіно-сцэнары выводзіць рэвалюцыянэра Пуліхава.

Перагляд існуючых падручнікаў.

Метадком НКА пераглядзіў існучыя падручнікі і дапаможнікі, якія можна перадрукоўваць бяз зьмен, або з кароткімі зьменамі. Разам з тым Метадком пастанавіў лічыць немэтазгодным як устарэлыя перадрукоўваць наступныя падручнікі: «Наша сіла—піва, ды машына»—для лікусткаў, «Родное слово» ч. 2, Некрашэвіча лекмантар Фодасенкі —«Чырвоная зьмена», Альгебра Кісялёва, Альгебраічныя задачнікі Ланкова, Альгебра ч. 1 і 2—Кругалевіча, усе тры часткі Траяноўскага і некаторыя іншыя.

СУД.
ШЛЮБ НА АДЗІН ДЗЕНЬ.

Вільданаў Юсуп, малады здаровы хлопец, рабочы будаўніц. кандыдат УсеКП(б), банкірам, родам з Уфімскай губ., у 1926 г. прыехаў у Менск і працаваў на работах гандлёвабудаўнічага тросту.

Жыў ён з адной жанчынай, як муж з жонкаю, але ня выпускаў момэнту, каб узвалачыцца за другімі.

У красавіку б. г. Вільданаў пазнаёміўся з Алесяй Пілецкай і ўвесь час скіляў яе ладзіцца яму. Пілецкая вагаралася на гэта толькі пасьля рэгістрацыі іх шлюбу ў Загсе.

28 ліпеня Вільданаў прышоў да Пілецкай палівіцыўны і пагражаючы рэвальвэрам, патрабаваў, каб яна стала яго жонкаю, абяцаючы заўтра запісацца ў Загсе, што апошняя вымушана была зрабіць. Назаўтра (гэта было ў суботу) Вільданаў і Пілецкая зарэгістравалі свой шлюб у Загсе. У тэты-ж дзень Вільданаў выпрасіў у Пілецкай 70 руб. на адзеньне. З суботы на нядзелю Вільданаў ночаваў у сваёй новай жонкі. У нядзелю Вільданаў паехаў у горад і больш да Пілецкай ня прыходзіў. У панядзелак Пілецкая пасьпела свайму мужу абед на работу. Вільданаў з вялікай прыемнасьцю прыняў ад Пілецкай абед, абяцаў яго, пацалаваў і абяцаў Пілецкай, што жыць з ёю больш ня будзе, бо яна, быццам, была «пяросная» і папрадзіў, што калі яна каму-небудзь скажа аб тым, што ён не кінуў, дык з ёю ён «разводзіцьць».

Пілецкая адмаўляла суворць Вільданава сяброў аб згвалтаваньні.

На судзе Вільданаў сьцьвярджаў, што Пілецкай ён не гвалціў і што моў з ёю ўпершыню шлюбны вносіны толькі пасьля рэгістрацыі іх шлюбу ў Загсе, а цяпер шкадуе з ёю жыць, бо «яна яму ня пара».

Менскі акруговы суд прышоў да высноў, што салаты акт паміж Пілецкай і Вільданавым моў месца пасьля рэгістрацыі іх шлюбу ў Загсе, і што за недахопам улік пасьля лічыць Вільданава вінаватым у згвалтаваньні Пілецкай, чаму і вынес Вільданаву адпаведны прыгавор.

Пілецкая абскарджала гэты прыгавор у Вярхоўны суд.

Вярхоўны суд прызнаў, што з усіх абставінаў справы і прызнаньня самога Вільданава відаць, што рэгістрацыяй шлюбу на адзін дзень Вільданаў дабіваўся выключна адной мэты—палавых вносін з Пілецкай, на што апошняя згадзілася, дазволіўшы зацукаваньне з боку Вільданава, што таксама дзеньне яго зьяўляецца сапраўдна небясьпечным і прадугледжана арт. 235 п. «а» КК (нов. рэд.)

На гэтай падставе Вярхоўны суд адрадзіў прыгавор Вільданаву Менскага акруговага адміністрацыйнага суду і справу для новага разгляду са стадыі судовага следзтва перадаў таму-ж суду прапанаваўшы адмяніць зараз-ка ўзяць Вільданава пад варту.

Е.

Што слухаць па радыё.

ПЯТНІЦА 28-га СЬНЕЖНЯ.

6-00—6-30 2-я лекцыя праф. Сірэціна «Целабачаньне па радыё».
6-30—6-55 3-я лекцыя з цыклю: «Зь вдаровую працу», „Такічныя умовы працы".
6-55—7-20 Музычныя адпачынкі.
7-20— Перадача праграмы.
7-25—8-10 «Беларуская радыёгазэта».
8-10—8-35 Разьвіцьцё юнацкага дзіцячага руху за 10 год.
8-45—11-00 Популярны канцэрт.

СУБОТА 29-га СЬНЕЖНЯ.

5-00—5-55 Дзіячы час.
6-00—7-25 Трансьляцыя вечару, прысьвечанага 10-цігодзьдзю Беларускае Сацыялістычнае Савецкае Рэспублікі.
7-25—7-45 Даклад з цыклю: „Савецкая Беларусь за 10 год". „Нацыянальнае і савецкі". Тав. Канцевіч.
7-45— Першая опера са студыі „Русалка" (на белар. мове).

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

УСЮДЫ ПОШТА ПРЫМАЕ ПАДПІСКУ

на ўсе газэты і часопісі,

не выключаючы выданьняў выдавецтва

„ИЗВЕСТИЯ ЦИК" і ПРАВДА".

У Менску зваНеце па тэлефону 5-33 і 9-96,

да вас прыдзе супрацоўнік газэтнага бюро для прыёму заказу.

Пошта нясе поўную адказнасьць за падпіску, прынятую ёю і яе лістаносцамі, газэтаносцамі і пасобнымі ўпаўнаважанымі.

Прыём падпіскі ў газэтным бюро, другі паверх, памяшканьне пошты, з 9 г. да 21 гадзіны,

НА ТЭЛЕГРАФЕ—КРУГЛЫЯ СУТКІ.

ЗГУБЛЕНЫ.

— Кааперац. кніжка Рабіновіча М. Л.—выд. МЦРК., кв. 292.
— Сяброўская кніжка № 167 Шыляўскага М. С. выд. Мазырск. праўленьн. спажывецк. т-ва „Смычка", кв. 293.
— Пашпарт Волкава Г. А.—выд. бакінскай Горміліц. 2-га раёну, кв. 294.
— Вайсковая кніжка № 66 Шелога К.М. —выд. Койданаўск. прызыўн. пунктам кв. 295.
— Спраўка аб працы Мацюка Я.—выд. Менск. Кам. гаспад., кв. 296.
— Пасьведчаньне на захаваньне браўнінга" за № 503736 Файнбурга І.—выд. Барысаўск. ДПУ кв. 297.
— 3 лётар. білета за № 795, 797, 799 Крукоўскага П.Ю.—выд. К-рай гав., «Савецк. Бел.» кв. 298.
— Сяброўскі білет № 310824 Дубінскага І. Г., выд. Мазырскім мясцкомам сарэа воднікаў, кв. 266.
— Даручэньне, выд. Белкачтрэстам ад 16-VI-28 г. за № 10903, сьведчаную ў Менскай Дзярж. Нот. канторы па рэестру за № 2-1645 на імя Пузеўскага Я. І., кв. 260.
— Вучотна-вайсковы білет № 107-30 Тарасевіча Б. В., выд. Менакрвенкаматам, кв. 264.
— 2 кв. за № 120 і № 135, выд. прыемн. Чэрвенск. Электрастанц. т. Івенюкам на прывезен. дровы у 1927 г. на імя Бурбуна І. кв. № 280.
— Сяброўская кніжка № 33754 Курэцк Л.Л.—выд. Любаньскім саюзам, працаўн. вымлі і лесу кв. 281.
— Пашпарт Супрыновіч Е. І.—выд. Мен акміліц., кв. 283.
— Кааперац. кніжка 2086 Тумара Д. выд. Барыс. аддзел. прыгаразд. кааперр. кв. 284.
— Кааперац. кніжка Грэч. К.—выд. МЦРК. кв. 285.
— Вучотна-конская карт. за № 35 Паўтарана М. П.—выд. Пятрыкоўскім РВК кв. 286.
— Асабовая кніжка Давідовіча А. В. —выд. Жыткавіцкім РВК, кв. 287.
— Пашпарт Фельдмана Л. Б.—выд. Менакміліц. кв. 288.
— Пасьведчаньне Шчуровіча М. І. на права правозу лесаматар'ялаў і мясасьці —выд. Астрашыцкім с.-с. кв. 289.
— Лекавая кніжка Замостыцкай К. В.— выд. Менакрстрахкасай, кв. 290.
— Пашпарт Дусавіцкай Б. Х.—выд. Магілёўскай міліц. кв. 291.
— Паваян кніжка № 330 Вінакура З.С., выд. Калінкавіцк. спаж. т-ва.
— Асабовая кніжка Будніка В. І., выд. Калінкавіцк. РВК.
— Конская кніжка № 4209 Зіновенка Т. С., выд. Калінкавіцк. РВК.
— 3 біржав. талёны Федарак Н. Е., выд. Мен. біржай працы, кв. 329.
— Асабовая кніжка № 201 Сямёнава І. І., выд. Калінкавіцк. РВК.

Абавязковая пастанова № 31
Менскага Гарадзкога Савету

26 сьнежня 1928 г.

У зьвязку з сьвяткаваньнем дзесяцігодзьдзя Існаваньня Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі, Менскі Гарадзкі Савет пастанаўляе:

1. Гандаль дзяржаўны, кааперацыйны і прыватны спыніць з 18 гадзін 31-га сьнежня 1928 г. і ва ўвесь дзень 1 студзеня 1929 году, за выключэньнем наступных магазынаў, якія могуць быць адчынены ў аўторак 1-га студзеня 1929 г.:

А) Ад 9 да 17 гадзін без перапынку.

1) МЦРК № 6—Скуравая вул. д. № 7а.
2) « № 11—р. Савецкай і Камароўскай вул. № 2.
3) « № 12—вул. Крапоткіна № 40.
4) « № 15—Савецкая вул. д. № 92.
5) « № 19—Няміга д. № 6.
6) « № 21—Маскоўская вул. № 43.
7) « № 24—р. Сьвярдлоўскай і вул. Карла Маркса д. № 15—1.
8) « № 25—р. Савецкай і Камсамольскай вул. (бакал. адзе.)
9) « № 28—Камсамольская вул. № д. 11.
10) « № 39—Савецкая вул. д. № 92.
11) « № 40—Ленінская вул. д. № 1.
12) « № 49—Ленінская вул. д. № 30.
13) « № 65—Савецкая вул. д. № 61.
14) Працалект. пекароў маг. № 1—Камунальная вул. д. № 14-18.
15) « « « № 2 — Савецкая вул. д. № 76.
16) « « « № 6—Інтэрнацыянальная д. № 7.
17) « « « № 8—Вялікая-Татарская вул. д. № 15-1.
18) Інвалідн. арцелі „Перамога"—магаз. № 5—Савецкая вул. д. № 35.

Б) Ад 9 ад 12 гадз.

19) Сельска-гасп. калён. «Зорка» № 2—Інтэрнацыянальн. вул. д. № 2.
20) Менск. сялянская малочн. т-ва № 1—Камсамольская вул. д. № 5.
21) Фэрма „Прыпукі-Атоліна"—Ленінская вул. д. № 26.
22) Інвал. арцелі „Перамога" № 4—Савецкая вул. д. № 62.
23) Усе магазыны МЦРК, ганцюючыя малаком, а імянна: №№ 60, 41, 31, 22, 55, 50, 34, 9, 8, 32, 42, 29, 38, 10, 96, 83, 109 і пары №№ 11 і 8.
2. Кафэ-рэстаранны, піўныя, закусачныя і сталоўкі вачыняць з 18 гадз. 31-га сьнежня 1928 г. і ва ўвесь дзень 1 студзеня 1929 г., за выключэньнем сталовак МЦРК:
а) № 1—Інтэрнацыянальная вул., д. № 8.
б) № 2—пер Савецкай і Энгельса, д. № 24-85.
в) № 6—Ленінская вул., д. № 1-9.
г) № 8— Савецкая вул., д. № 69,
якія мэгуць быць адчынены: першыя 3—ад 9 да 18 гадз., а апошнія—ад 9 да 24 гадз.

Увага: 31 сьнежня сталоўкі МЦРК і ТПО МБВ адчынены, як у звычайныя часы.

3. Працу у прадпрыёмствах, за выключэньнем тых, якія ня могуць быць вачынены, спыніць не пазьней 18 гадз. 31 сьнежня 1928 г. і на ўвесь дзень 1 студзеня 1929 г.

4. Працу ў цырульнях і фатаграфіях спыніць з 18 гадз. 31-га сьнежня і на ўвесь дзень 1 студзеня.

5. Дазволіць 29, 30 і 31 сьнежня працу ва ўсіх цырульнях і фатаграфіях і гандаль ва ўсіх крамах без палудзённага перапынку.

6. Дазволіць гандлёвым прадпрыёмствам, якія маюць выхадны дзень суботу, ці нядзелю, гандляваць 29 і 30 сьнежня.

7. Нагляд за выкананьнем гэтай абавязковай пастановы ўскласьці на міліцыю.

8. Вінаватыя ў парушэньні гэтай абавязковай пастановы падлягаюць адказнасьці ў адміністрацыйным парадку: штрафу да 100 руб. ці прымусовых работам да 1 м.-ца.

Намесьнік Старшыні Менскага Гарадзкога Савету РАБІНОВІЧ.

Сэкратар Менскага Гарадзкога Савету ПАСЫНКОЎСКІ

Галоўлітбел 302. Менск, дзяржаўная друкарня